ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Нацвер 10 сакавіка 1938 г., № 14 (356)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення ССПБ і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

СМЕРЦЬ ФАШЫСЦКІМ ГАДАМ!

Круг злачынстваў завершан. Галаварэзы з «права-трацкісцкага блока» дайшлі да свайго лагічнага канца — выканання волі сваіх гаспадароў, крывавых фашыстаў. Стаўшы на антыленінскі шлях, аўтары «тэорый» «перманентнай рэволюцыі» і «арганізаванага капіталізма» дакаціліся да бандытызма, шпіянажу і дыверсій, здрадніцтва радзіме, да злачынстваў, якіх не ведае гісторыя чалавецтва.

Банда прафесіянальных шпіёнаў, правакатараў і забойцаў з «права-трацкісцкага блока» агулам і ў розніцу прадавала нашу радзіму. Украіну яны ахвотна аддавалі нямецкім фашыстам, Беларусь — польскім панам, Прымор'е — фашысцкім самураям, Сярэдне-Азіяцкія рэспублікі і Паўночны край — англійскім банкірам. Яны хацелі адабраць ад народаў Совецкага Саюза самае дарагое — уладу рабочых і сялян, шчасце і радасць, рэстаўрыраваць у СССР капіталізм.

З працэса над «права-трацкісцкім блокам» мы даведаліся, што гэтыя гадзюкі, майстры чорных спраў, яшчэ ў 1918 годзе разам з эсэрамі ўзнялі сваю брудную руку на Леніна, Сталіна і Свердлова. Яшчэ тады яны хацелі абязгlавіць рабочых і сялян, адабраўшы ў нас любімых правадыроў, правадыроў сусветнага пролетарыята, геніяў прагрэсіўнага чалавецтва — Леніна і Сталіна, вернага сына народа Свердлова.

Крывавыя фашысцкія сабакі з «права-трацкісцкага блока» забілі лепшага сына партыі Сяргея Міронавіча Кірава, умярцвілі Валерыяна Владзіміравіча Куйбышэва, Вячаслава Рудольфавіча Менжынскага, яны забілі сотні рабочых і сялян, пускалі пад адхон пяязды, узрывалі фабрыкі і заводы, атручвалі жывёлу, арганізоўвалі голад у краіне. Праклятыя бандыты пазбавілі жыцця гонар і славу нашай радзімы, буравесніка соцыялістычнай рэволюцыі, геніяльнага пісьменніка, друга працоўных — Аляксея Максімавіча Горкага.

Усе прайдзісветы, шпіёны, забойцы і здраднікі, аб'яднаўшыся ў «права-трацкісцкі блок», натхняемыя Іудай-Троцкім, обер-бандытамі бухарынымі, рыкавымі, ягодамі ды іншай поганню, павялі шалёную атаку супроць ленінска-сталінскай лініі, супроць соцыялізма.

Шпіёны ўсіх марак — шаранговічы, ікрамавы ды інш., выконваючы заданні генеральных штабаў фашысцкіх дзяржаў, рабілі ўсё для таго, каб справакаваць вайну супроць Совецкага Саюза, каб дабіцца паражэння нашай соцыялістычнай радзімы ў вайне. Прадажныя скуры, сусветныя палітычныя прастытуткі ні перад чым не спыняліся, абы дасягнуць сваёй мэты — нізвяржэння совецкай улады.

За кожным з сядзячых на лаве падсудных ланцуг крывавых злачынстваў, ганебна страшны шлях. Мацёры воўк польскай дэфензівы Шаранговіч, прыкідваючыся ягнём, наносіў беларускаму народу ўдар за ўдарам у спіну Прадаўшыся са сваёю паганаю скураю польскім і нямецкім гаспадарам, бандыты шаранговічы, чарвяковы, галадзеды, уся нацыянал-фашысцкая брыда здзекваліся з беларускага народа. Яны шкодзілі як толькі маглі і дзе маглі.

Выконваючы дырэктывы «права-трацкісцкага блока», польскай дэфензівы і нямецкага гестапо (як відаць з працэса, гэтыя дырэктывы не разыходзіліся паміж сабою), беларускія нацыянал-фашысты разгарнулі шкодніцтва ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, а таксама на культурным фронце і ў прыватнасці па лініі школ, у пісьменніцкай арганізацыі, у тэатры. Як высветлілася з паказання бандыта Шаранговіча, нацыянал-фашысты вялі ярасную барацьбу супроць калгаснага будаўніцтва, зрывалі землеўпарадкаванне, насаджалі на калгаснай зямлі соўгасы, заражалі жывёлу. За адзін толькі 1936 год у Беларусі знішчана каля 30 тысяч коней.

Суд крок за крокам разматвае клубок крывавых злачынстваў супроць совецкага народа, здзейсненых бандай правакатараў і забойцаў з антысовецкага «права-трацкісцкага блока». Свяшчэннай нянавісцю напоўнены сэрцы нашага народа да гэтых вырадкаў роду чалавечага, якія асмеліліся ўзняць руку на заваёвы Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі ў СССР, хацелі адабраць у народаў СССР геніяльнага Сталіна і яго бліжэйшых саратнікаў.

Працэс над бандай ашалелых фашысцкіх сабак, над усімі гэтымі бухарынымі, рыкавымі, ягодамі, крэсцінскімі ды іншымі адкідамі чалавечага грамадства з усёй нагляднасцю паказвае, у якое балота вядуць фашысты, на якія агіднасці яны ідуць, каб стрымаць магутны поступ народаў Совецкага Саюза, якія пад кіраўніцтвам мудрай партыі Леніна — Сталіна ідуць па шляху да комунізма.

Няма такой сілы, якая-б спыніла прагрэс чалавечага грамадства. Кола гісторыі расцісне усялякую чалавекападобную мерзасць, якая паспрабуе прыпыніць рух наперад.

Працоўныя Совецкага Саюза бязмерна ўдзячны слаўным чэкістам і сталінскаму наркому Нікалаю Іванавічу Ежову за іх верную службу народу, за выкрыццё падкалодных гадзюк, якія імкнуліся затапіць у крыві заваёвы Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі.

Чорныя сілы контррэволюцыі хацелі вярнуць уладу памешчыкаў і капіталістаў, уваскрасіць постаць жандара ў новай яго якасці — фашыста, вярнуць удасканалены бізун — гумавую дубінку, усе атрыбуты капіталізма.

Народы СССР бязмерна ўдзячны свайму правадыру, любімаму другу і настаўніку Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну за яго штодзённыя клопаты аб вызваленым чалавеку, аб лёсе першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы, Сталіну, які не адзін раз напамінаў нам аб капіталістычным абкружэнні, аб пільнасці, дзякуючы чаму выкрыты гэтыя здраднікі — ворагі народа.

Рабочыя і сяляне нашай радзімы, інтэлігенцыя, увесь совецкі народ аднадушна патрабуюць бязлітаснага знішчэння здраднікаў і забойцаў, правакатараў і шпіёнаў.

Смерць фашысцкім гадам!

НЯМА МЕСЦА ГНУСНЫМ ЗДРАДНІКАМ НА СВЯШЧЭННАЙ СОВЕЦКАЙ ЗЯМЛІ

Цяжка знайсці адпаведныя словы, каб азначыць усю подласць і нізасць людскога падзення, да якога дайшлі азвярэлыя ворагі народа з «права-трацкісцкага блока». Ніякімі спосабамі не грэбавалі яны ў сваёй пачварнай злабе супроць краіны Советаў, яе кіраўнікоў і лепшых людзей.

Буравеснік рэволюцыі, палкі трыбун прагрэсіўнага чалавецтва Аляксей Максімавіч Горкі, да голаса якога так чутка прыслухоўваліся лепшыя людзі эпохі, — стаўся афяраю подлых фашысцкіх наймітаў. Гэта ён вялікі і благародны, пісьменнік-грамадзянін пісаў аб здрадніках: «Калі хочуць растлумачыць з'яву занадта арыгінальную — параўноўваюць яе з чым-небудзь больш звычайным і зразумелым, шукаюць «аналогіі». Але здраднік, гэта — настолькі своеасаблівае, агіднае стварэнне прыроды класавай дзяржавы, што параўнаць здрадніка няма з кім і няма з чым. Я думаю, што нават тыфозную вош параўнанне са здраднікам зняважыла-б».

Кляймом праклящця кладуцца гэтыя, поўныя абурэння і прэзрэння, словы на подлыя галовы забойцаў з «права-трацкісцкага блока». Брудны ланцуг злачынстваў цягнецца за імі на працягу доўгіх гадоў гнуснага іх жыцця. Шпіёнскія зносіны з прадстаўнікамі замежных агрэсараў, цесны кантакт з чужаземнымі бандытамі і забойцамі, эмблемамі якіх з'яўляецца кроў мільёнаў працоўнага народа, голад, няволя, паварот да самых змрочных дзён мінуўшчыны; агідны гандаль вялікаю совецкаю зямлёю, здрада, правакацыя; разбойніцкае змоўніцтва, накіраванае на асобы, чые імёны сталі сімваламі вызвалення працоўнага чалавецтва, увасабленнем яго надзей на свабоду, на шчасце на зямлі...

Больш нізкага, агіднага, подлага злачынства не ведае крымінальнае права.

Халопы міжнароднага фашызма ненавідзелі нашу шчаслівую радзіму і шкодзілі ёй як толькі маглі. Усімі сіламі імкнуліся яны задушыць рост і квітненне соцыялістычнай культуры нацыянальных рэспублік. Але не ўдалося гэта і не ўдасца ніколі бандытам і галаварэзам тыпу Шаранговіча. Расце і квітнее соцыялістычная культура брацкіх рэспублік у рэзультаце няўхільнага правядзення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Фашысцкім вырадкам не павінна быць месца на свяшчэннай совецкай зямлі. Гэта смуродныя жывыя трупы, што разносяць вакол сябе атруту і заразу. Караючы меч совецкага правасуддзя павінен абясшкодзіць нашу соцыялістычную радзіму ад смуроду і заразы страціўшых чалавечае аблічча двуногіх гадаў.

Совецкі народ, чыёю крывёю заваявана свабода і шчасце, супроць якіх змагаліся злачынцы бухарыны, рыкавы, ягоды, шаранговічы і іншая гнусь, патрабуе гэтага ад нашага суда.

Я. КОЛАС.

Б А С Т А!

Дзе стану, дзе гляну, — радзіма,
Ты ўсюды шырока ляжыш:
Ад Арктыкі і да Крыма,
Ад Менска да Усходняй мяжы.
Спяваюць усюды народы
Пра яснага шчасця пару.
І віхрам ляцяць карагоды...
І цёплыя поціскі рук...
Па гэтай зямлі ўрачыстай
Хадзілі, як лярвы, яны;
Кляліся не здраджваць раз трыста...
О, чорныя здані вайны!
Паслухай у гневе, радзіма.
Узняўшы над гадамі меч, —
Наш Горкі задушаны імі...
Смяротнай будзь, кара, за смерць!
Яны рыхтавалі нам астму,
Таемныя колбы атрут.
Паны, дакаціліся?!
Баста!
Народ вам свой піша прысуд.
Усіх вас, і «левых» і правых,
З зямлі большэвіцкай сатрэ
Народная наша расправа —
Расстрэл!

Міх. КАЛАЧЫНСКІ.

СЛАВА МУЖНЫМ СЫНАМ ВЯЛІКАЙ РАДЗІМЫ!

ПРЫКЛАД МУЖНАСЦІ

Вельмі цяжка выказаць у словах тое захапленне, якое агортвае мяне. Подвіг папанінцаў — незвычайная з'ява ў галіне палярных даследванняў, у галіне імкненняў выдатных прадстаўнікоў чалавечай культуры да полюса.

Толькі 170-мільённы саюз народаў пад кіраўніцтвам найвялікшага генія чалавецтва таварыша Сталіна заваяваў полюс, паслаўшы ў экспедыцыю сваіх адважнейшых сыноў.

Подвіг гэты — найвялікшы прыклад мужнасці для кожнага грамадзяніна Совецкага Саюза. Гераізм і адвага папанінцаў — узор паводзін на службе дзяржаве, да якога павінен імкнуцца кожны рабочы, інжынер, артыст, музыкант, прадстаўнік кожнай прафесіі на кожным участку соцыялістычнай працы і творчасці.

Няхай жывуць нашы героі — Папанін, Крэнкель, Ширшоў, Фёдараў!

БАРЫС ЛІВАНАУ.

Заслужаны артыст рэспублікі, ордэнаносец.

СЛАВА ГЕРОЯМ!

Шмат незабыўных, гераічных, вялікіх мінут перажыла наша выдатная радзіма! Шмат разоў, прытаіўшы дыханне, усе чакалі вестак аб падзеях, якімі па праву ганарыцца Совецкі Саюз.

Гераізм, бязмежная мужнасць слаўных папанінцаў, нашых родных, любімых братоў — узнімае на велізарную вышыню совецкага грамадзяніна. Словамі цяжка перадаць тыя думкі і пачуцці, якія ахапілі мяне, калі я даведалася, што закончан шматмесячны гераічны дрэйф нашых герояў на палярнай ільдзіне. Надзвычайныя цяжкасці перанесла слаўная чацвёрка, паказаўшы ўсяму свету вытрымку і мужнасць совецкага грамадзяніна, які працуе на карысць усяго чалавецтва, узнімае ўсё вышэй і вышэй сцяг Леніна—Сталіна, сцяг комунізма.

Слава, слава, слава дарагім нашым героям — Папаніну, Крэнкелю, Фёдараву і Шыршову!

Вера ПАШЭННАЯ.

Народная артыстка СССР, ордэнаносец.

Песняй сустрэнем АДВАЖНЫХ

Слаўным героям, заваявальнікам Паўночнага полюса — таварышам Папаніну, Крэнкелю, Шыршову і Фёдараву, якія ўклалі ў гісторыю навукі найкаштоўнейшыя адкрыцці па асваенню Арктыкі, шлю сардэчнае і палкае прывітанне. У дзень іх прыбыцця ў чырвоную сталіцу чырвонасцяжны ансамбль пад маім дырыжорствам сустрэне слаўную чацвёрку яркай і бадзёрай песняй.

А. АЛЕКСАНДРАУ.

Народны артыст Саюза ССР, прафесар-ордэнаносец.

ВІТАЮ СМЕЛЫХ

Справа чацвёркі герояў-папанінцаў — легенда, ператвораная ў сапраўднасць поспехамі нашай шчаслівай сталінскай эпохі.

Толькі эпоха Сталіна нараджае такі гераізм, заснаваны на адвазе, навуцы і дакладных разліках, і гераізм гэты дае нябачаныя ў свеце рэзультаты.

Я шчыра вітаю адважных Папаніна, Крэнкеля, Шыршова, Фёдарава, якія стварылі магутную, узрушаючую сімфонію гераізма. Цісну руку ім — гераічным сынам нашай вялікай радзімы.

Я шчаслівы, што я — грамадзянін вялікай Совецкай краіны, якая выхавала такіх самаадданых, магутных людзей.

М. ШТЭЙНБЕРГ.

Народны артыст СССР, ордэнаносец.

Дэкада рускай класічнай музыкі

11 сакавіка ў Менску пачынаецца дэкада рускай класічнай музыкі з удзелам калектываў Дзяржфілармоніі, Белдзяржтэатра оперы і балета, Кансерваторыі і Радыёкамітэта.

У плане дэкады — дзесяць сімфанічных, камерных і сольных канцэртаў. У некаторых канцэртах прымуць удзел салісты буйных гарадоў Саюза ССР.

У праграме канцэртаў — творы кампазітараў Глінкі, Чайкоўскага, Мусоргскага, Рымскага-Корсакава, Рубінштэйна і інш. Кожнаму канцэрту будзе прысвечана ўступнае слова.

У праграме першага вечара — 11 сакавіка — мантаж оперы «Руслан і Людміла» у выкананні сімфанічнага аркестра Філармоніі і салістаў Тэатра оперы і балета і Радыёкамітэта.

Плакат, выпушчаны Саюзфота («Фотамастаком»).

Рэпрадукцыя Шышко (БСФ).

Я. Журба

П А П А Н І Н Ц А М

Я слаўлю смелых,
Я слаўлю мужных, —
Героям слаўным
Я шлю прывет.
Адвага, ўпартасць,
Бясстрашнасць, цвёрдасць
Усхвалявалі
Увесь сусвет.

Вялі вы смела
Змаганне з морам,
Заваявалі
Глухую стынь;
Адкрылі свету
Вы таямніцы
Палярных водаў,
Марскіх глыбінь.

Уцеха й гордасць
Мяне ўзнімаюць,
Бо я — цудоўнай
Краіны сын:
Штандар герояў
Гарыць зарою
Над краем шчасця,
Жыцця-красы.

Я слаўлю смелых,
Я слаўлю мужных,
Героям слаўным
Я шлю прывет.
Адвага, ўпартасць,
Бясстрашнасць, цвёрдасць
Усхвалявалі
Увесь сусвет!

Анатоль Астрэйка

ВАМ, ДЭПУТАТЫ-ГЕРОІ

Дзе нага чалавека ніколі
Не кранала сцяжынак мядзвежых, —
Асвятліла там снежнае поле
Зорка з яснай з крэмлёўскае вежы.

Над пургой, над пустыняю гордай
Запалаў сцяг краіны Советаў,
Сонцам Сталіным, дружбай народаў,
Дарагою радзімай сагрэты.

І раз'юшаны скрыгат ільдзінаў,
І магутнейшай сілы навала
Прад сынамі вялікай радзімы
У смяротных баях адступала.

Не зраўняць Одысею і Трою
З вашым мужным лядовым паходам!
Слава вам, дэпутаты-героі,
Выхаванцы героя-народа!

Вы пазналі ўсе таямніцы
Чараўнічых арктычных крышталаў,
Вас чакае сусвету сталіца,
Руку цёпла паціснe вам Сталін.

Хай-жа помняць фашысцкія орды,
Хай-жа ведаюць грозную сілу,
Тую сілу і мужнасць народа,
Што стыхію навек пакарыла.

ЧАЦВЁРКА ХРАБРЫХ

Неперадаваемыя пачуцці радасці ўсхвалявалі мяне, калі прышла вестка аб зняцці з ільдзіны чацвёркі герояў-папанінцаў. І цяпер, калі Ленінград мае гонар першым сустракаць іх на совецкай зямлі бадзёрымі, здаровымі пасля 274 дзён гераічнай працы ў найцяжэйшых умовах — я ганаруся за сваю радзіму, за слаўных герояў, выхаваных партыяй Леніна—Сталіна, за ўвесь совецкі народ.

Горача вітаю Вас, дарагія героі, з найлепшым выкананнем складанейшых задач.

Дзень Вашага прыбыцця ёсць свята ўсяго совецкага народа, узрасціўшага такіх бясстрашных барацьбітоў за навуку, за светлую будучыню ўсяго чалавецтва.

Няхай жывуць слаўныя папанінцы!

Няхай жыве наш родны друг, натхніцель усіх перамог таварыш Сталін!

Л. АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ.

Заслужаная артыстка БССР.

Вамі ганарыцца РАДЗІМА

Новыя бліскучыя старонкі ўпісалі ў гісторыю сусветнай навукі слаўныя сыны нашай любімай радзімы — Папанін, Крэнкель, Фёдараў, Шыршоў.

Гераічнымі ўчынкамі гэтай чацвёркі ганарыцца ўся наша радзіма. 9 месяцаў з неаслабнай увагай сачылі мы за слаўнай працай гераічнай чацвёркі, захапляліся адвагай і мужнасцю верных сталінскіх выхаванцаў.

Няма слоў, каб перадаць пачуццё радасці і гордасці за нашу радзіму, за партыю Леніна—Сталіна, якая выхавала такіх герояў. Гераічная чацвёрка выдатна выканала заданне партыі і ўрада, заданне вялікага Сталіна.

Толькі ў нашай краіне могуць быць здзейснены такія подвігі.

У сваёй творчай рабоце мне хочацца стварыць вобраз аднаго з герояў-папанінцаў, паказаць гледачу героя сталінскай эпохі, патрыёта-большэвіка.

Слава героям, пакарыцелям Арктыкі — тт. Папаніну, Шыршову, Крэнкелю, Фёдараву!

Прывітанне вам, дарагія таварышы, адважныя сыны нашай радзімы!

Моцна цісну вашы рукі!

В. ВЛАДАМІРСКІ.

Заслужаны артыст БССР.

ПАКАРЫЦЕЛЯМ АРКТЫКІ

З захапленнем глядзім мы за тым, як слаўныя сыны нашай радзімы — папанінцы зрабілі небывалы ў гісторыі чалавецтва подвіг. Толькі ў краіне соцыялізма, у краіне, дзе прагрэсіруе навука і культура, змаглі вырасці героі, робячыя такія слаўныя подвігі. Совецкія кампазітары павінны стварыць манументальныя творы на тэму аб нашых героях і іх подвігах.

Вітанне і слава героям-папанінцам!

Кампазітар А. БАГАТЫРОЎ.

ВЯЛІКІ УКРАІНСКІ НАРОДНЫ ПАЭТ І МАСТАК

9 сакавіка споўнілася 124 гады з дня нараджэння вялікага украінскага народнага паэта, мастака і палітычнага дзеяча Тараса Грыгор'евіча Шэўчэнкі.

Шэўчэнка прышоў у літаратуру як баец: ён у кожны свой твор ўкладваў баявы «мужыцкі тэмперамент», сваю глыбокую нянавісць да дваранска-памешчыцкага ладу. Ён прышоў у грамадскае жыццё і літаратуру для таго, каб сказаць горкую праўду і заявіць свой пратэст супроць рабскага жыцця.

Яго творы паказваюць, як балюча было яму бачыць і адчуваць, якому гвалту, гнёту і здзекам падвяргаюць яго «сардэчную», «сярмяжную» Украіну царскія сатрапы, каты, папы і памешчыкі. Ён імкнуўся да свабоднай Украіны, імкнуўся на руінах «турмы народаў» царскай Расіі стварыць новую Украіну — Украіну свабодную, вольную — «сям'ю вольную, новую».

Велізарнае значэнне Шэўчэнкі як паэта адсунула ў цень яго творы як мастака. Яго карціны і малюнкі доўгія годы не былі сабраны, не былі так шырока вядомы, як яго паэтычная творчасць.

Шэўчэнка пакінуў вялікую мастацкую спадчыну, перавышаючую 1000 карцін, малюнкаў і накідаў, якія даводзяць, што ён і ў галіне выяўленчага мастацтва быў вялікім і вельмі арыгінальным майстрам.

Натхніцелі ўкраінскай і рускай контррэволюцыі, польскія і нямецкія фашысты ў барацьбе супроць соцыялістычнай Украіны спрабавалі і спрабуюць атруціць свядомасць працоўных ядам нацыяналізма. Скарыстоўваючы рознастайныя сродкі ідэалагічнай падрыхтоўкі вайны і інтэрвенцыі, яны ўсяляк фальсіфіцыруюць літаратурную спадчыну Шэўчэнкі, старанна абыходзячы глыбока рэволюцыйную соцыяльную сутнасць песняра прыгнечанага прыгоннага сялянства.

У краіне пролетарскай дыктатуры творчасць Шэўчэнкі, крытычна ацэненая ў святле марксізма-ленінізма, была і будзе зброяй рэволюцыйнага выхавання, усямернага ўмацавання братняга адзінства працоўных усіх нацый.

Верны да канца сваім рэволюцыйным перакананням, нязломны і непахісны, абкружаны шалёнай нянавісцю ворагаў, дзікай злобай, патокам бесшабашнай ілжы і паклёпу, пастаяннымі праследваннямі эксплаататарскіх класаў, народны песняр Шэўчэнка сышоў у магілу.

Творчасць Шэўчэнкі, побач з літаратурнай спадчынай вялікіх дэмакратаў — Белінскага, Чэрнышэўскага, Дабралюбава, уваходзіць у той унаследаваны ад баявога рэволюцыйнага мінулага фонд, які павінен быць скарыстаны пры стварэнні новай соцыялістычнай культуры.

Да 125-годдзя з дня нараджэння вялікага кабзара Белдзяржвыдавецтва павінна выдаць творы Т. Г. Шэўчэнкі ў перакладах на беларускую мову. Частка гэтых твораў («Кацярына», «Сон» і інш.), перакладзена ўжо народным паэтам БССР Янкам Купалам.

ПРАЦЭС АНТЫСОВЕЦКАГА „ПРАВА-ТРАЦКІСЦКАГА БЛОКА“

Дзённік вячэрняга пасяджэння 4 сакавіка

На вячэрнім пасяджэнні суд перайшоў да допыту падсуднага Розенгольца. Асвятліўшы сваю трацкісцкую работу з 1920—21 гг., Розенгольц паведаміў, што сувязь яго з Троцкім аднавілася з дапамогаю Крэсцінскага ў 1929 годзе. У 1933—1934 гг. ён двойчы сустракаўся за граніцаю, у Аўстрыі і ў Карлсбадзе, з Седовым, які перадаў яму дырэктыву аб устанаўленні сувязі з правымі і з групай Тухачэўскага. У выкананне гэтай дырэктывы, гаворыць Розенгольц, Крэсцінскі і ажыццяўляў сістэматычную сувязь з Тухачэўскім. Сам-жа Розенгольц быў звязан з Рыкавым і Рудзутакам.

Радам пытанняў тав. Вышынскі выкрывае некаторыя ўмоўчванні Розенгольца. Высвятляецца, што яшчэ пры сустрэчы з Седовым у Карлсбадзе Розенгольц атрымаў ад Троцкага ўказанне аб тым, што контррэвалюцыйны пераварот варта прыўрочыць да моманту ваеннага нападу на СССР. Розенгольц і Крэсцінскі прызнаюць, што пасля арышту раду ўдзельнікаў змовы, у тым ліку Пятакова, Троцкі ў адным з пісем патрабаваў фарсіраваць контррэвалюцыйны пераварот. Высвятляецца актыўная роля Крэсцінскага ў перамаўленнях з Тухачэўскім з гэтага повраду, прычым Крэсцінскі заяўляе, што Тухачэўскага асабліва прыспешваць не трэба было, таму, што ён сам «спяшаўся». Троцкі патрабаваў адказаць на прыгавор па справе Пятакова тэрарыстычнымі актамі супроць кіраўнікоў партыі і ўрада.

Тут-жа высвятляецца адна абставіна, якая пралівае святло на паводзіны Крэсцінскага ў першы дзень гэтага працэса. Крэсцінскі прызнаецца, што Троцкі ў сваім пісьме выказваў абурэнне з прычыны адкравеннага прызнання Пятаковым на судзе сваёй віны і патрабаваў, каб змоўшчыкі ў выпадку арышту адмаўлялі сваю віноўнасць.

— Можа быць, вашы паводзіны на судзе два дні таму назад таксама былі прадыктаваны вось гэтай дырэктывай? — пытаецца пракурор у Крэсцінскага.

У адказ чуецца разгубленае мармытанне.

Прадоўжваецца допыт Розенгольца. У канцы сакавіка 1937 года ў Розенгольца адбылася нарада з Крэсцінскім і Тухачэўскім. Высвятляецца, што пасля арышту Ягоды Крэсцінскі сістэматычна і ўпарта падштурхоўваў Тухачэўскага фарсіраваць правядзенне контррэвалюцыйнага перавароту.

Далей Розенгольц паказвае, што па яго даручэнню, з дапамогаю Седова і адпаведных замежных фірм Троцкаму было перададзена да 300 тысяч долараў з фонда Экспартлеса Фінансавыя каналы Наркамзамежгандлю выкарыстоўваліся таксама для перадачы Троцкаму 110 тысяч долараў штогод, не лічачы цэлага раду іншых «узносаў» на трацкісцкую дзейнасць.

З цынічным спакоем мацёрага шпіёна расказвае Розенгольц аб тым, што яшчэ ў 1923 годзе па прапанове Троцкага ён перадаваў кіраўніку рэйхсвера Германіі генералу Секту весткі аб савецкіх ваенна-паветраных сілах, а пазней і сакрэтныя весткі па замежнаму гандлю. Розенгольц праводзіў сваю шпіёнскую работу сістэматычна. Ён праводзіў шкодніцкую работу ў сістэме Наркамзамежгандлю.

Суд пераходзіць да допыту падсуднага Крэсцінскага. Крэсцінскі расказвае, што здрадніцкая яго работа пачалася яшчэ ў 1921 годзе, калі ён уступіў у нелегальны трацкісцкі цэнтр у складзе Троцкага, Пятакова, Серэбракова, Прэабражэнскага. Годам пазней, па даручэнню Троцкага, ён заключыў пагадненне з генералам Сектам аб сталай грашовай субсідыі ад рэйхсвера трацкісцкай арганізацыі ў абмен за перадачу шпіёнскіх вестак. Пагадненне выконвалася да 1926 года, калі рэйхсвер паведаміў аб адмаўленні ад яго, што аказалася толькі манеўрам для заключэння новага, больш выгоднага рэйхсверу пагаднення. Трацкісты абавязаліся сістэматычна перадаваць шпіёнскія весткі, а ў выпадку захопу ўлады забяспечыць інтарэсы германскай буржуазіі. Такім чынам, з 1923 па 1930 год трацкісцкая контррэвалюцыйная арганізацыя атрымлівала штогод ад рэйхсвера 250.000 германскіх марак.

Пры ад'ездзе з Германіі Крэсцінскі дамовіўся аб тым, што грошы варта ўручаць Путне, які быў тады ваенным аташэ ў Берліне.

У 1929 годзе, у часе адпачынку і лячэння ў Кісінгене, Крэсцінскі меў спатканне з Седовым і атрымаў указанне Троцкага аб неабходнасці для знаходзячыхся ў Саюза ССР трацкістаў падаваць заявы аб адмаўленні ад трацкізма, закансгіырыравацца і дзейнічаць метадамі двурушніцтва. Некалькі пазней Троцкі патрабаваў пераходу да тэрору, падрыхтоўкі забойстваў кіраўнікоў партыі і ўрада. Пры сустрэчы з Крэсцінскім у Меране Троцкі заявіў, што ўладу можна захапіць толькі сілаю, а так як сілы трацкісцкай арганізацыі недастатковыя, дык патрэбна звярнуцца за дапамогаю замежных дзяржаў. Пачатак гэтаму пакладзены ўжо ў даўнішнім пагадненні з рэйхсверам, але ва ўмовах гітлерызацыі Германіі гэта пагадненне ўстарэла. Фашыстам патрэбна не толькі шпіёнская інфармацыя трацкістаў. Ім патрэбны калоніі. У выпадку прыходу загаворшчыкаў да ўлады патрэбы фашысцкай Германіі будуць задаволены за кошт некаторай часткі тэрыторыі Савецкага Саюза. Тады-ж Троцкі заявіў, што неабходна падрыхтаваць сілы і ўнутры Савецкага Саюза для мяркуемага захопу ўлады. Троцкі рэкамендаваў звязацца з Рыкавым, Бухарыным, а таксама з Рудзутакам і Тухачэўскім. Нарэшце, Троцкі патрабаваў разгортвання тэрору, дыверсій, шкодніцтва. У часе гэтай размовы ў Меране Троцкі выказваў незадавальненне тым, што Розенгольц «за апошні час нічым сябе не праяўляе», і прапанаваў Крэсцінскаму «актывізаваць» Розенгольца.

Аб сваіх гутарках з Троцкім Крэсцінскі інфармаваў Пятакова, Розенгольца, Тухачэўскага і Рудзутака. Пасля гэтага «права-трацкісцкі блок» узмоцнена рыхтаваў контррэвалюцыйны пераварот. Гэты пераварот прыстасоўваўся да пачатку вайны з Германіяй. У канцы снежня 1936 года была атрымана дырэктыва Троцкага ўсямерна паскорыць ажыццяўленне контррэвалюцыйнага перавароту.

З далейшага допыту Крэсцінскага высвятляецца, што гэты обер-падручны Троцкага сам уваходзіў у бандыцкі цэнтр «права-трацкісцкага блока», пасля таго, як адтуль «выбылі» выкрытыя ворагі народа Пятакоў, Зіноўеў, Енукідзе, Рыкаў і іншыя. Крэсцінскі там імкнуўся прадоўжваць іх іудзіну справу, праектаваў разам з Тухачэўскім, Розенгольцам, Гамарнікам тэрарыстычныя акты і контррэвалюцыйныя выступленні. Але органы НКВД своечасова абарвалі гэтыя подлыя варожыя махінацыі. Обер-падручны Троцкага быў арыштаваны.

Цяпер ён трымае адказ па усё сукупнасці сваіх іудзіных спраў.

На гэтым допыт падсуднага Крэсцінскага заканчваецца.

У канцы вячэрняга пасяджэння суд прыступае да допыту падсуднага Ракоўскага.

Дзённік ранішняга пасяджэння 5 сакавіка

Усю першую палову ранішняга пасяджэння Ваеннай Калегіі Вярхоўнага Суда Саюза ССР 5 сакавіка заняў допыт падсуднага Ракоўскага.

Ракоўскі, па ўласнаму яго прызнанню, на працягу 35 год з'яўляецца «палітычным і асабістым прыяцелем» закаранелага обер-бандыта Троцкага. Усе гэтыя годы Ракоўскі заставаўся яго нязменным прыхільнікам і зброеносцам, не парываў з ім сувязі, верай і праўдай служыў гэтаму адданаму найміту фашызма.

Факты няўмольныя. Маска з твару Ракоўскага сарвана. Ён стаіць перад судом, як драпежны, каварны вораг, поўны лютай злабы супроць сацыялізма, супроць савецкага народа, як мацёры шпіён, які прадаваўся фашысцкім разведкам.

Яшчэ ў 1924 годзе Ракоўскі прадаецца «Інтэліджэнс Сервіс». Ён стаў шпіёнам англійскай разведкі з благаславення Троцкага.

Аднак... ёсць усе падставы лічыць, што шпіёнская прафесія Ракоўскага пачалася значна раней. Ён паведамляе суду, што агенты «Інтэліджэнс Сервіс» Армстронг і Лекерт, прышоўшыя да яго ў Лондане ў 1924 годзе па даручэнню англійскай разведкі, прад'явілі пісьмо, напісанае ў часе імперыялістычнай вайны і прызначанае для германскай разведкі. У пісьме былі шпіёнскія весткі аб Румыніі. Пад пісьмом стаяў подпіс Ракоўскага.

На судзе Ракоўскі прабуе аспрэчваць сапраўднасць свайго подпісу і дае збіўчывыя адказы на пытанні тав. Вышынскага па гэтаму поваду.

Дзяржаўны абвінаваўца тав. Вышынскі быў у праве заявіць на судзе аб сваіх вялікіх падазрэннях, што пісьмо, якое прад'явілі Армстронг і Лекерт Ракоўскаму, было не падробленым, а сапраўдным і што ўжо тады, у часе сусветнай вайны, Ракоўскі, які знаходзіўся ў Румыніі, быў агентам германскай разведкі.

Бандыты былі варты адзін аднаго. Яны разам ажыццяўлялі варожыя, антысавецкія замыслы. Яны разам шпіёнілі для замежных разведак у інтарэсах барацьбы з партыяй і савецкай уладай. І прызнанні Ракоўскага паказваюць, да якой глыбіні падзення дайшлі гэтыя здраднікі.

Ракоўскі паведамляе суду аб сваёй сустрэчы з Троцкім у 1928 годзе напярэдадні ад'езду апошняга ў ссылку ў Алма-Ату. Троцкі падзяліўся тады са сваім аднадумцам планам уцёку з Алма-Аты за граніцу. На пытанне Ракоўскага, якім чынам Троцкі думае зрабіць пабег праз пустыні і горы Сярэдняй Азіі, Троцкі яму сказаў, што ён спадзяецца на дапамогу «Інтэліджэнс Сервіс». І тут-жа Троцкі канфідэнцыяльна паведаміў Ракоўскага, што ён, Троцкі, звязан з «Інтэліджэнс Сервіс» з 1926 года праз аднаго з прадстаўнікоў канцэсіі «Лена-Гольдфільдс» і што англійская разведка дапаможа яму ўцячы з Савецкага Саюза.

Так рабіліся контррэвалюцыйныя справы. Ракоўскі перадае шпіёнскія матэрыялы «Інтэліджэнс Сервіс». Тое-ж самае робіць і Троцкі. Ракоўскі вярбуе для англійскай разведкі новых агентаў. Троцкі ў абмен за некаторыя паслугі з боку гэтай разведкі дапамагае англійскім кансерватарам ажыццявіць разрыў адносін з Савецкім Саюзам. Ён кансультыруе «цвёрдалобага» кансерватара Хікса, як лепш стварыць інцыдэнт з СССР. Ён падказвае налёт на Аркос. Мала таго, праз сваіх падручных у Аркосе ён забяспечвае Хіксу і «повад» для разрыву адносін, фабрыкуе правакацыйныя дакументы, якія лонданскія трацкісты падкінулі ў памяшканне Аркоса.

Такая «палітычная і асабістая дружба» пражжоных бандытаў.

Гэтае цеснае саўдзельніцтва шпіёнаў і нягоднікаў, аб'яднаных аднымі крывавымі інтарэсамі, прадаўжаецца і пасля таго, як Троцкі быў выкінут за межы Савецкага Саюза, аж да арышту Ракоўскага.

У верасні 1934 года Ракоўскі на чале савецкай дэлегацыі таварыства Чырвонага Крыжа выехаў на міжнародную канферэнцыю ў Токіё. І там ён ахвотна ідзе насустрач пажаданням нейкай высокапастаўленай асобы пануючых колаў Японіі супрацоўнічаць з японскай разведкай «у інтарэсах,—як заявіла гэта асоба, — той плыні (гэта значыць трацкізма), якую вы (гэта значыць Ракоўскі) прадстаўляеце».

Рэзультат ясны:

«Я вярнуўся ў Савецкі Саюз з мандатам японскага шпіёна», — цынічна заяўляе падсудны.

Ракоўскі звязваецца з прадстаўнікамі права-буржуазных колаў Францыі і вядзе падрыўную работу супроць франка-савецкага збліжэння.

Адзін варожы акт ідзе за другім. Здрадніцтва ідзе за здрадніцтвам. Трацкісцкі паплечнік, румынскі памешчык, авантурыст, які дарэшты схлусіўся, ён старанна выконвае заданні заклятага ворага савецкага народа Троцкага і іх агульнага гаспадара — фашысцкіх агрэсараў.

Допыт поўнасцю агаляе зладзейскія злачынствы Ракоўскага. І калі пракурор тав. Вышынскі, рэзюміруючы паказанні Ракоўскага, пытае яго, як трэба кваліфікаваць усе гэтыя злачынствы, то выкрытаму шпіёну нічога не астаецца, як поўнасцю прызнаць сябе віноўным у дзяржаўнай здрадзе, у подлай антысавецкай дзейнасці, у падрыхтоўцы дзяржаўнага перавароту ў інтарэсах фашызма, у тым, што «права-трацкісцкі блок» з'яўляецца атрадам фашысцкай агрэсіі.

***

У другой палове ранішняга пасяджэння суд пераходзіць да допыту падсуднага Зеленскага.

З незвычайным цынізмам Зеленскі паказвае аб сваіх кашмарных злачынствах супроць рэвалюцыі і савецкага народа. У 1911 годзе ён быў завербаваны самарскім жандарскім упраўленнем у якасці агента-асведаміцеля. Ён атрымлівае ў ахранцы клічкі «Ачкасты», а затым «Салаф». У яго «паслужным спісе» праз некаторы час ужо значыліся здрадніцкія выдачы кіраўнікоў Самарскай с.-д. арганізацыі, падрыхтоўка і ажыццяўленне правалу ўсёй Самарскай с.-д. арганізацыі.

Правакатарскі стаж Зеленскага гэтым, аднак, не вычэрпваецца.

Дзяржаўны абвінаваўца тав. Вышынскі напамінае падсуднаму аб яго сувязях не толькі з самарскім, але таксама з саратаўскім і арэнбургскім ахраннымі аддзяленнямі. Гаспадары цанілі свайго вернага пса. Зеленскі пачаў сваю правакатарскую работу з 25 рублёў «жалованья» ў месяц, а праз некаторы час ён атрымліваў ужо... 100 рублёў.

Гнусны здраднік Зеленскі прабуе прыкінуцца «Иваном, не помнящим родства».

Тады тав. Вышынскі агалашае адносіну арэнбургскай ахранкі, у якой кіраўнік ахранкі пытаў: «Прашу паведаміць, што такое магло здарыцца за апошні час з Зеленскім?»

Правакатарам Зеленскім цікавілася таксама і саратаўская ахранка.

Пракурор гаворыць: — Усе, значыць, з вамі шукаюць сувязі і клапоцяцца аб вашым лёсе. Так гэта ці не?

І «Ачкасты» адказвае: — Факты такія.

Баючыся свайго выкрыцця, Зеленскі далучаецца да фашысцкай банды правых рэстаўратараў капіталізма. Будучы на адказнай рабоце ў Сярэдняй Азіі, ён разам з буржуазнымі нацыяналістамі ажыццяўляе шкодніцтва ўсюды і ва ўсім. Гэта ён ажыццяўляў грубейшыя перагібы ў калгасным будаўніцтве Сярэдняй Азіі.

Шкоднікі і дыверсанты з права-трацкісцкай банды, якія арудвалі ў Цэнтрасаюзе на чале з обер-бандытам Зеленскім, перш за ўсё зрывалі гандаль таварамі шырокага спажывання. Так, у першым квартале 1936 года многія раёны Курскай вобласці тыднямі не атрымлівалі цукру. Раёны Ленінградскай вобласці доўгі час не мелі махоркі. Летам 1936 года рад сельскіх пагранічных раёнаў Беларусі доўгі час не атрымліваў печанага хлеба. У тым-жа годзе шкоднікі з Цэнтрасаюза, па ўказцы Зеленскага, знішчылі ў Маскве 50 вагонаў яек.

Фашысцкі вырадак Зеленскі спакойна паказвае далей, што пасля абследвання гандлёвай сеткі гандлёвай інспекцыяй у першым квартале 1936 года не было солі ў 3.700 крамах. У 2.000 крамах не аказалася цукру. 1.600 крам не мелі махоркі.

Разблытваючы клубок злачынстваў Зеленскага і яго саўдзельнікаў у галіне вытворчасці і гандлю маслам, тав. Вышынскі пытае:

— Ці былі выпадкі, што члены вашай арганізацыі, якія маюць адносіны да масляной справы, у масла падкідвалі шкло?

Зеленскі. Былі выпадкі, калі ў масле аказвалася шкло.

Вышынскі. Не «аказвалася», а падкідвалася шкло. Вы разумееце розніцу: падкідвалася шкло. Былі выпадкі такія, ці не?

Зеленскі. Былі выпадкі, калі ў масла падкідвалася шкло.

Вышынскі. Ці былі выпадкі, калі вашы саўдзельнікі, саўдзельнікі злачыннай змовы супроць савецкай улады і савецкага народа, падкідвалі ў масла цвікі?

Зеленскі. Былі выпадкі.

Вышынскі. Вось гэта і ёсць арганізацыя шкодніцкай, дыверсійнай работы. У гэтым вы сябе прызнаеце віноўным?

Зеленскі. Прызнаю.

Сістэматычныя аблічванні і абмерванні пакупнікоў, замарожванне таваразабароту, вялізныя растраты і раскрадванні, падбор у кааперытыўны апарат эсэраў, меншавікоў, анархістаў і белагвардзейцаў у мэтах стварэння паўстанцкіх груп — вось злачыннейшыя «справы» Зеленскага.

Праз замежнае бюро Цэнтрасаюза Зеленскі рассылаў за граніцу паклёпніцкую інфармацыю аб рабоце савецкай кааперацыі. Зеленскі паказаў, што вёў перагаворы з лідэрам англійскай кааператыўнай партыі Александэр аб падтрыманні гэтай партыяй правых у выпадку захвату імі ўлады...

Такі правакатар, шкоднік, шпіён Зеленскі, адзін з актыўных «дзеячоў» права-трацкісцкай банды.

На сканчэнні допыту падсуднага Зеленскага дзённае пасяджэнне суда заканчваецца.

Дзённік вячэрняга пасяджэння 5 сакавіка

Вячэрняе пасяджэнне Ваеннай Калегіі Вярхоўнага Суда СССР 5 сакавіка пачынаецца допытам падсуднага Ікрамава.

Ікрамаў паказвае, што з'яўляўся ў мінулым членам буржуазна-нацыяналістычных груповак, у 1923 годзе быў трацкістам, а з 1928 года ўступіў у падпольную контррэвалюцыйную нацыянал-фашысцкую арганізацыю «Милли Истиклял». Гэта арганізацыя рыхтавала кадры для антысавецкіх выступленняў. Удзельнікі гэтай арганізацыі забілі грамадзяніна Абід Саідава, які імкнуўся выкрыць нацыянал-фашыстаў ва Узбекістане.

Узбекскія нацыянал-фашысты падрывалі дэханскую гаспадарку, зрывалі калектывізацыю. Яны губілі тысячы тон баваўны, сабатыравалі раённае будаўніцтва, шкодзілі ў гарадской гаспадарцы. Такімі метадамі нацыянал-фашысцкія правакатары разлічвалі адарваць сялянскія масы Узбекістана ад савецкай улады.

У часе свайго прыезду ва Узбекістан у 1933 годзе Бухарын устанавіў сувязь з Ікрамавым у мэтах сумеснай контррэвалюцыйнай работы. З гэтага часу нацыянал-фашысты Узбекістана па сутнасці сталі састаўной часткай «права-трацкісцкага блока». Па заяве Ікрамава, Бухарын інструктаваў яго па частцы арганізацыі паўстанцкіх атрадаў і ажыццяўлення шкодніцтва.

Апытаны пракурорам Бухарын адмаўляе, што інструктаваў Ікрамава аб ажыццяўленні шкодніцтва. Аднак Ікрамаў напамінае яму месца і абставіны, у якіх адбываўся інструктаж.

Сустрэчным допытам Ікрамава, Бухарына і Хаджаева ўстанаўліваецца, што па прамой дырэктыве «права-трацкісцкага блока» нацыянал-фашысты Узбекістана прынялі «англійскую арыентацыю», г. зн. сталі агентурай англійскага імперыялізма ў савецкіх рэспубліках Сярэдняй Азіі.

На гэтым канчаецца допыт падсуднага Ікрамава.

Дзяржаўны абвінаваўца дапытвае падсуднага Бессонава адносна тых перагавораў, якія апошні вёў ад імя «права-трацкісцкага блока» з асколкамі эсэраўскай эміграцыі за граніцай. З паказанняў Бессонава відаць, што адзін з эсэраўскіх главароў, Маслаў, пражывае ў Празе, дзе прадаўжае праводзіць антысавецкую работу, знаходзячыся на ўтрыманні адначасова польскіх, румынскіх, балгарскіх і югаслаўскіх «кругоў». У той-жа час эсэраўская арганізацыя звязана з партыяй Генлейна — агентурай германскага фашызма ў Чэхаславакіі — і атрымоўвае ад яе грошы. Пры перагаворах Бессонава з Маславым высветлілася, што гэты прадажны эсэраўскі паследыш ставіў дзве асноўныя ўмовы для супрацоўніцтва эсэраў з «права-трацкісцкім блокам»: па-першае, грошы ў замежнай валюце; па-другое, грошы ў валюце савецкай... для эсэраў! І подлы дагавор трацкістаў з эсэрамі быў заключаны.

Суд пераходзіць да допыту падсуднага Бухарына.

Бухарын перш за ўсё выражае просьбу: дазволіць яму выгрузіць перад судом «ідэйны» багаж «права-трацкісцкага блока» і прытым «у сувязным выкладанні». Старшынствуючы тав. Ульрых растлумачвае падсуднаму Бухарыну, што ён абавязаны нароўні з іншымі падсуднымі прытрымлівацца савецкага працэсуальнага кодэкса і пагэтаму павінен даць адказ аб сваёй непасрэднай здрадніцкай, шпіёнскай і тэрарыстычнай рабоце. Пад агнём пытанняў тав. Вышынскага Бухарын далей прызнае і наяўнасць згод, заключаных «права-трацкісцкім блокам» з агрэсіўнымі кругамі Германіі, Японіі, Англіі, на ўмовах расчлянення СССР і адтаржэння ад савецкай краіны Украіны, Беларусі, Прымор'я.

— А як наконт шкодніцтва? — задае тав. Вышынскі сугуба практычнае пытанне гора-тэарэтыку «права-трацкісцкага блока».

І Бухарын скрозь зубы прызнае, што гэты контррэвалюцыйны блок ставіў сабе задачай шкодніцтва з мэтай падрыву абароназдольнасці савецкай краіны.

— А адносна дыверсійных актаў? — няўмольна прадоўжвае дапытваць дзяржаўны абвінаваўца.

Бухарын імкнецца адвярцецца, запэўняючы, што ён займаўся толькі «праблематыкай агульнага кіраўніцтва і ідэалагічным бокам».

Шляхам апытання падсуднага Хаджаева абвінавачванне ўстанаўлівае, што Бухарын даваў Хаджаеву вельмі практычныя ўказанні аб ўзмацненні шкодніцтва і арганізацыі паўстанцкіх атрадаў, якія не мелі нічога агульнага з «ідэалогіяй».

Запінаючыся і блытаючы, Бухарын ў канцы канцоў прызнаецца, што «права-трацкісцкі блок» займаўся арганізацыяй паўстанцкіх атрадаў і што ён, Бухарын, нясе адказнасць за гэту падрыўную дзейнасць.

— Установка на арганізацыю тэрарыстычных актаў, на забойства кіраўнікоў партыі і савецкага ўрада ў блоке была? — пытае Вышынскі.

— Яна была...

Апытаны пракурорам Рыкаў прымушаны прызнаць, што адзін з арганізатараў зладзейскага забойства Сяргея Міронавіча Кірава, Енукідзе, прадстаўляў у «права-трацкісцкім блоку» правую частку гэтага блока.

Апытаны з гэтай прычыны Ягода заявіў, што Рыкаў і Енукідзе ўдзельнічалі на пасяджэнні цэнтра, дзе было прынята рашэнне аб забойстве Кірава.

Дзяржаўны абвінаваўца дапытвае, як Бухарын у 1918 годзе рыхтаваў арышт і забойства Владзіміра Ільіча Леніна. Бухарын пацвярджае, што ён быў прыхільнікам арышта Владзіміра Ільіча Леніна, аднак адмаўляе, што падрыхтоўваў яго забойства, і ледзь не бажыцца, што такая магчымасць была выключана.

— У вас быў план арышту ў 1918 годзе таварыша Сталіна? — прадоўжвае дапытваць тав. Вышынскі.

Бухарын прызнае, што ў «левых камуністаў» быў план арышту Леніна, Сталіна і Свердлова, але прадоўжвае адмаўляць, што даваў указанні аб іх забойстве.

У сувязі з гэтымі запэўніваннямі Бухарына дзяржаўны абвінаваўца хадайнічае перад судом аб выкліку ў якасці сведак былых удзельнікаў групы «левых комуністаў»: Якаўлевай, Осінскага, Манцэва, а таксама былых членаў ЦК левых эсэраў Караліна і Камкова. Суд задавольвае гэта хадайнічанне.

Затым Бухарын пачынае тонам лектара выкладаць установкі «права-трацкісцкага блока», шчыгіляючы завумнымі тэрмінамі і славеснымі выкрутасамі. Ён гаворыць аб безлічных праграмках, аб прэславутай бухарынскай «школцы».

З асаблівай ганарыстасцю падкрэслівае Бухарын, што ён не быў «стрэлачнікам» контррэвалюцыі, а з'яўляўся адным з яе лідэраў.

Старшынствуючы растлумачвае Бухарыну, што ён будзе мець дастаткова часу, каб гаварыць на падобныя тэмы ў сваім апошнім слове, і прапануе яму трымацца выкладання фактычнага боку сваёй злачыннай антысавецкай работы.

Суд хоча высветліць, якім чынам Бухарын яшчэ ў 1918 годзе імкнуўся ўзняць руку на Леніна, на Сталіна, на Свердлова. Пракурор задае падсуднаму рад пытанняў, звязаных з прабываннем Бухарына ў перыяд перад гэтым за граніцай.

Бухарын прызнае, што пражываў у 1912—1913 гадах у Аўстрыі. Пракурор дапытвае, ці не быў ён там завербаваны паліцыяй. Бухарын гэта адмаўляе.

Пасля свайго прабывання ў Аўстрыі Бухарын пражываў доўгі час у Амерыцы і вярнуўся ў Расію праз Японію, дзе заставаўся некаторы час.

Пракурор пытае, ці не быў ён завербаваны органамі разведкі ў Амерыцы ці ў Японіі. Бухарын разыгрывае глыбокае абурэнне. Аднак старшыня суда растлумачвае, што пытанні пракурора ўпаўне законны.

І сапраўды, як можна вытлумачыць, што Бухарын, толькі-што вярнуўшыся ў рэвалюцыйную Расію з-за граніцы, арганізаваў тайную змову супроць Леніна. Мала таго, замышляў узняць сваю подлую руку на геніяльнага правадыра працоўных — Владзіміра Ільіча Леніна.

За позным часам праця̆г допыту Бухарына пераносіцца на раніцу 7-га сакавіка.

Дзённік ранішняга пасяджэння 7 сакавіка

На ранішнім пасяджэнні Ваеннай Калегіі Вярхоўнага Суда СССР прадаўжаўся допыт падсуднага Бухарына.

Бухарын усяляк пазбягае прамых адказаў на канкрэтныя пытанні Дзяржаўнага абвінаваўцы, абходзіць вострыя куты, штомінутна пускаецца ў падрабязнейшыя тлумачэнні.

Пракурор крок за крокам выкрывае злачынствы крывавага бандыта, і Бухарын, прыпёрты да сцяны, прызнаецца ў радзе сваіх кашмарных злачынстваў.

Галоўны вынік, пацверджаны ўсім ходам допыту Бухарына, заключаецца ў тым, што ён быў актыўным кіраўніком «права-трацкісцкага блока», непасрэдным арганізатарам шпіянажа, дыверсій, шкодніцтва.

Бухарын з'яўляецца непасрэдным арганізатарам кулацкіх паўстанняў. Для гэтага ён пасылаў свайго падручнага Слепкова, кваліфікаванага майстра контррэвалюцыйных спраў, на Паўночны Каўказ. Для гэтага ён пасылаў у Сібір мярзаўца Якавенка. Па ўказанню Бухарына Слепкоў звязваецца праз Піваварава з главарамі казацкага контррэвалюцыйнага саюза і праз іх з эміграцкімі казацкімі коламі за рубяжом.

Бухарын адобрыў ініцыятыву свайго падручнага, шпіёна Карахана, які вёў здрадніцкія перагаворы з нямецкімі фашыстамі аб дапамозе антысавецкім змоўшчыкам. Гэта ён, нібы займаўшыйся толькі «праблематыкай» кіраўніцтва, гандляваў савецкай зямлёй, абяцаючы за фашысцкую дапамогу аддаць немцам Савецкую Украіну.

Праз нацыянал-фашысцкую арганізацыю ў Беларусі «права-трацкісцкі блок» і яго кіраўнік Бухарын звязваецца з польскай разведкай, з польскім генеральным штабам. Пад крылышкам Бухарына і Рыкава арудуюць такія мацёрыя шпіёны, як Шарангович, Галадзед, Чарвякоў. Бухарын, Рыкаў кіруюць іх работай, выконваюць заданні польскай разведкі, імкнучыся падарваць абаронную магутнасць заходняга фарпоста Савецкага Саюза — Беларускую ССР. І сувязь з панскай Польшчай, як сазнаецца падсудны, даходзіць да таго, што змоўшчыкі з «права-трацкісцкага блока» ўзгадняюць... з польскай разведкай назначэнне новых работнікаў на адказныя пасты ў Беларусі. За дапамогу блоку з боку фашысцкай Польшчы Бухарын і яго прысныя, у выпадку свайго прыходу да ўлады, абяцаюць аддаць польскім панам Савецкую Беларусь.

Бухарын пастаянна клапоціцца аб пашырэнні шпіёнскіх сувязей. У час сваёй паездкі ва Узбекістан, ён прапануе свайму паплечніку Файзуле Хаджаеву ўстанавіць сувязі з англійскімі рэзідэнтамі, г. зн. з англійскай разведкай.

Аб'яднацца з усімі контррэвалюцыйнымі сіламі ў інтарэсах барацьбы з савецкай уладай — вось лінія, якую праводзіць Бухарын. Праз эсэра Семёнава ён звязваецца з астаткамі разгромленай эсэраўскай партыі ўнутры Савецкага Саюза і за рубяжом. Эсэры даюць згоду на падтрыманне блока.

Ідуць тайныя перагаворы аб гарантыях для ажыццяўлення кулацкай палітыкі ў выпадку захвату ўлады «права-трацкісцкім блокам», ідуць перагаворы аб легалізацыі партый эсэраў і меншавікоў, аб кааліцыйным урадзе з контррэвалюцыйных партый. У 1936 годзе Бухарын пасля разгавору з Рыкавым устанаўлівае праз Нікалаеўскага сувязь з меншавікамі і знаходзіць у іх асобе дастойных аднадумцаў. Яны заклікаюць на дапамогу II Інтэрнацыянал.

Няма меры подласці, каварству ворага, няма меры яго вывёртванню, хітрасці, яго вынаходніцтву, яго выкрутам. Няма меры яго страшэнным злачынствам. Допыт паказвае, што Бухарын быў прыхільнікам адкрыцця фронта ў вайне з інтэрвентамі. Ён займаў паражэнчую пазіцыю, ён рабіў усё для таго, каб прынесці шкоду магутнасці Савецкага Саюза, ён звязваўся з усімі цёмнымі, варожымі народу сіламі.

Высвятляецца цікавая дэталь. Змоўшчыкі намерваліся адкрыць фронт немцам, а вінаватых у паражэнні на фронце лічылі мэтазгодным аддаць пад суд. «Гэта, — паказаў Бухарын на папярэднім следстве, — дасць нам магчымасць пацягнуць за сабой масы, іграючы патрыятычнымі лозунгамі». Такава была іезуіцкая тактыка Бухарына і ўсяго «права-трацкісцкага блока» — смярдзючай клаакі, дзе капашылася контррэвалюцыйная нечысць усіх сартоў.

На лаве падсудных — закаранелы шпіён, крывавы забойца, найміт фашысцкіх разведак, здольны на ўсякую чорную справу, здраднік радзімы.

Паказанні сведкі Якаўлевай, дапытанай у канцы ранішняга пасяджэння, пацвярджаюць, што гнуснейшыя злачынствы Бухарына не выпадковы, што ён ужо даўно з'яўляецца ворагам народа. Якаўлева — адна з відных удзельніц групы так называемых «левых» комуністаў у 1918 годзе— паказала, што Бухарын меў сумесна з «левымі» эсэрамі план звяржэння савецкага ўрада на чале з Леніным, арышту і фізічнага знішчэння Леніна, Сталіна, Свердлова і арганізацыі новага ўрада «левых» комуністаў і эсэраў. Праграма барацьбы з савецкай уладай была выкладзена Бухарыным у рэзалюцыі Маскоўскага абласнога бюро. Пасля таго, як «левыя» комуністы пацярпелі паражэнне і перамаглі прыхільнікі Леніна, гэта рэзалюцыя, пагражаўшая раскрыццём падпольнай работы «левых» комуністаў, па прапанове Бухарына, была із'ята Якаўлевай і Манцэвым з пратаколаў і знішчана. Бухарын пацвярджае, што ў 1918 годзе быў план звяржэння ўрада Леніна і арышту Леніна, Сталіна, Свердлова.

***

У канцы дзённага пасяджэння тав. Вышынскі агалашае заяву доктара Беластоцкага аб некаторых акалічнасцях гнуснага ўмярцвення Максіма Горкага ўдзельнікамі права-трацкісцкай банды і хадайнічае аб далучэнні гэтай заявы да справы. Тав. Вышынскі хадайнічае перад судом аб выкліку ў якасці сведкі доктара М. Ю. Беластоцкага і ў якасці медыцынскіх экспертаў заслужанага дзеяча навукі прафесара Н. А. Шэрашэўскага, заслужанага дзеяча навукі прафесара Д. А. Бурміна, прафесара В. Н. Вінаградава, прафесара Д. М. Расійскага і доктара медыцынскіх навук В. Д. Зіпалава.

Суд задавальняе хадайніцтва пракурора. На гэтым ранішняе пасяджэнне заканчваецца.

Дзённік вячэрняга пасяджэння 7 сакавіка

На вячэрнім пасяджэнні 7 сакавіка Ваенная Калегія Вярхоўнага Суда СССР працягвала допыт сведкі Якаўлевай. З паказанняў Якаўлевай вынікала з поўнай відавочнасцю, што падсудны Бухарын быў галоўным арганізатарам змовы «левых комуністаў» і «левых» эсэраў у 1918 годзе. Гэта страшэнная змова праследвала мэту звяржэння савецкай улады, арышту і забойства Леніна, Сталіна і Свердлова.

Пасля сведкі Якаўлевай дае паказанні сведка Осінскі, які з'яўляўся ў 1918 годзе адным з кіраўнікоў групы «левых комуністаў». Осінскі паказвае, што побач з адкрытай фракцыйнай барацьбой супроць кіраўніцтва партыі група «левых комуністаў» яшчэ, з пачатку 1918 года перайшла да злачынных нелегальных дзеянняў.

У асабістым разгаворы з Осінскім Бухарын гаварыў аб неабходнасці арышту і забойства Леніна, Сталіна і Свердлова. У той-жа гутарцы з Осінскім Бухарын указаў, што ім прымаюцца меры да расшырэння «базы змовы». Бухарын паведаміў аб сваіх перагаворах па гэтаму поваду з Зіноўевым і Каменевым, граўшымі двайную

(Працяг на 3 стар.).

ПРАЦЭС АНТЫСОВЕЦКАГА „ПРАВА-ТРАЦКІСЦКАГА БЛОКА“

Дзённік вячэрняга пасяджэння 7 сакавіка

(ПРАЦЯГ)

ігру супроць партыі: не выступаючы адкрыта супроць пазіцыі Леніна ў пытанні аб Брэсцкім міры, яны на справе змагаліся супроць гэтай пазіцыі. Такую-ж двулічную лінію праводзіў і Троцкі, маскіраваўшы хлуслівымі лозунгамі сваю шалёную барацьбу супроць заключэння Брэсцкага міру. «Левымі комуністамі» быў устаноўлен блок з «левымі» эсэрамі і пазней — з правымі эсэрамі. Мяцеж «левых» эсэраў у 1918 годзе быў арганізаван у поўнай адпаведнасці з устаноўкамі, выпрацаванымі ў ходзе сумесных перагавораў «левымі комуністамі» і «левымі» эсэрамі. Бухарын быў у курсе падрыхтоўкі «левымі» эсэрамі ўзброенага мяцежа супроць совецкай улады, быў у курсе падрыхтоўкі імі арыштаў і забойстваў кіраўнікоў совецкага ўрада і партыі большэвікоў.

Сведка Манцэў паведамляе тыя-ж факты, што і папярэднія два сведкі. Ен расказвае аб тым, што ў 1918 годзе «левы комуніст» Стукаў рабіў на пасяджэнні ў Маскоўскім абласным бюро даклад па ўстаноўках Бухарына, у якім гаварыў аб неабходнасці звяржэння совецкай улады, арышту і фізічнага знішчэння кіраўнікоў партыі і ўрада — Леніна, Сталіна, Свердлова; па дакладу Стукава было вырашана прадаўжаць перагаворы з «левымі» эсэрамі, г. зн. падтрымліваць з імі блок. Пратакол гэтага пасяджэння быў занесен у кнігу пратаколаў Маскоўскага абласнога бюро. У паследку, калі партыя разбіла фракцыю «левых комуністаў» і ў маскоўскай арганізацыі было выбрана кіраўніцтва з прыхільнікаў партыйнай лініі, Бухарын прапанаваў Манцэву і Якаўлевай знішчыць гэты пратакол. Гэта і было зроблена ўначы абодвума канспіратарамі ў адпаведнасці з указаннямі Бухарына.

Падсудны Бухарын прабуе галаслоўна адмаўляць паказанні сведкаў Якаўлевай, Осінскага і Манцэва. Пад цяжарам доказаў ён вымушан прызнаць, што даваў змоўшчыкам з групы «левых комуністаў» дырэктыву аб арыштце Леніна, Сталіна, Свердлова. Але тут-жа ён спяшыць заявіць, што ініцыятарам падрыхтоўкі арышту з'яўляўся Троцкі, пусціўшы тады ў ход здрадніцкую формулу аб неабходнасці «складання новага кабінета». Па словах Бухарына ён падтрымліваў устаноўку Троцкага.

Сведкі Якаўлева, Осінскі і Манцэў настайваюць на ўсіх сваіх паказаннях. Сведка Якаўлева напамінае Бухарыну, што яна асабіста вяла з ім разгавор аб забойстве Леніна, Сталіна і Свердлова. У прыпёртага да сцяны забойцы Бухарына вырываецца прызнанне, што ён даваў змоўшчыкам дырэктыву «аб прымяненні гвалтоўных способаў пры арышце» кіраўнікоў урада.

Бухарын задае сведкам кручкатворскія пытанні з яўнай мэтай заблытаць і зацягнуць судовае следства.

Пракурор тав. Вышынскі ставіць сведкам дадаткова пытанні адносна ролі Бухарына ў змове 1918 года, аб яго ўдзеле ў замаху на свабоду і жыццё кіраўнікоў партыі і ўрада. З адказаў відаць, што Бухарын адыграў у гэтай зладзейскай змове ролю галоўнага падбухторшчыка.

Сведка Манцэў дапаўняе свае паказанні паведамленнем, што ў 1919 г. Троцкі ў асабістай гутарцы з ім дзяліўся планамі звяржэння ўрада, арышту і забойства таварыша Сталіна сіламі яго, Троцкага, асабістай аховы. У 1920 годзе сведка Манцэў у парадку выканання службовых абавязкаў дакладваў Троцкаму аб расследванні замаху, прадпрынятага на таварыша Сталіна ў Харкаве. Троцкі з усмешкай прапанаваў яму не раздуваць справы, каб не пацярпелі «нашы таварышы». Расследванне было спынена.

Гэтыя факты Манцэў утаіў ад партыі і совецкіх органаў.

Суд пераходзіць да допыту сведкі Камкова, былога члена ЦК партыі «левых» эсэраў. Камкоў паказвае, што яшчэ ў перыяд заключэння Брэсцкага міру ў разгаворы з ім Бухарын унёс прапанову аб звяржэнні совецкага ўрада і стварэнні ўрада з «левых комуністаў» і «левых» эсэраў. У якасці кандыдата на пост главы такога ўрада Бухарын назваў Пятакова. Адначасова Бухарын прапанаваў арыштаваць Леніна. Ініцыятыва гэтага разгавору зыходзіла ад Бухарына. У далейшым «левыя комуністы» і «левыя» эсэры заключылі пагадненне на аснове гэтых устаповак.

Камкоў, які з'яўляўся ў 1918 годзе адным з арганізатараў мяцежа «левых» эсэраў і забойства германскага пасла Мірбаха, сцвярджае далей, што Бухарын быў у курсе падрыхтоўкі мяцежу, быў у курсе арганізацыі забойства Мірбаха.

Апошнім з групы сведкаў апытваецца Карэлін, які таксама быў ў 1918 годзе членам ЦК партыі «левых» эсэраў і з'яўляўся адным з галоўных удзельнікаў перагавораў «левых» эсэраў з «левымі комуністамі». З боку першых у перагаворах удзельнічалі Карэлін, Камкоў, Прош'ян і Натансон, з боку другіх — Бухарын, Пятакоў, Радэк. Карэлін лічыць змоўніцкі блок «левых комуністаў» і «левых» эсэраў заключаным са снежня 1917 года. У ходзе перагавораў было вырашана арганізаваць звяржэнне совецкага ўрада шляхам узброенага мяцежа. Бухарын выказваўся за тое, каб змоўшчыкі «не спыняліся» перад забойствам Леніна і Сталіна. Падрыхтоўка мяцежа «левых» эсэраў у 1918 годзе вялася з ведама і санкцыі «левых комуністаў». Бухарын ведаў і аб падрыхтоўцы забойства Мірбаха; ён начат назваў гэты правакацыйны акт «эфектным і эфектыўным крокам».

Карэлін заяўляе, што пасля падаўлення мяцежа «левых» эсэраў Бухарын быў у курсе падрыхтоўкі правымі эсэрамі подлага замаху на жыццё таварыша Леніна. Больш таго, Бухарын фарсіраваў ажыццяўленне гэтага тэрарыстычнага акта, прыспешваў забойцаў. Гэтымі паказаннямі Карэліна ўстанаўляецца ўдзел Бухарына ў арганізацыі замаху эсэркі Каплан на жыццё правадыра працоўных Владзіміра Ільіча Леніна.

Данае паказанне Карэліна пацвярджае і дапытаны пракурорам сведка Осінскі, які паказвае, што пасля замаху эсэркі Каплан ён даведаўся са слоў «левага комуніста» Стукава аб тым, што замах з'яўляўся рэзультатам устаповак і арганізацыйных мерапрыемстваў злачыннага блока «левых комуністаў» і «левых» эсэраў.

Бухарын юродствуе, прадаўжаючы адмаўляць сваю саўдзельнасць да арганізацыі тэрарыстычных актаў на жыццё кіраўнікоў партыі і ўрада.

Дзяржаўны абвінаваўца тав. Вышынскі ўстанаўляе, што Бухарын прыступіў да азлабленай барацьбы супроць большэвіцкай партыі неадкладна пасля свайго звароту з-за граніцы ў 1917 г.

Тав. Вышынскі на паседжанні 5 сакавіка задае Бухарыну пытанне: ці не давалі яму якія-небудзь спецыяльныя органы заданні аб барацьбе з совецкай уладай і аб забойстве Леніна, Сталіна і Свердлова. Забойца Бухарын прадаўжае адмаўляць сваю сувязь з замежнымі разведкамі, аб наяўнасці якой сведчаць усё новыя і новыя доказы.

Перад скончаннем пасяджэння пракурор тав. Вышынскі фармулюе рад пытанняў медыцынскай экспертызе. Гэтыя пытанні маюць мэтай высветліць абстаноўку зладзейскага ўмярцвення М. Горкага, Куйбышэва, Менжынскага і Максіма Пешкова (сына М. Горкага), а таксама абставіны замаху, зробленага абвінавачваемымі Ягодай і Буланавым на жыццё тав. Н. І. Ежова. Эксперты ў складзе заслужанага дзеяча навукі прафесара Н. А. Шэрашэўскага, заслужанага дзеяча навукі прафесара Д. А. Бурміна, прафесара В. Н. Вінаградава, прафесара Д. М. Расійскага і доктара медыцынскіх навук В. Д. Зіпалава займаюць адведзеныя ім месцы ў зале суда.

Дзённік ранішняга пасяджэння 8 сакавіка

У сваёй звярынай нянавісці да большэвіцкай партыі, да совецкага народа бандыты з «права-трацкісцкага блока» не спыняліся перад подлымі забойствамі лепшых сыноў нашай краіны. Ад крывавай рукі забойцаў з права-трацкісцкай банды загінулі кіраўнік АДПУ Менжынскі, выдатны дзеяч совецкай дзяржавы Куйбышэў, вялікі пролетарскі пісьменнік Горкі і яго сын М. Пешкоў. Са спакоем і разлічанасцю вопытнейшых галаварэзаў задумалі бандыт Ягода і іншыя ўдзельнікі «блока» сваё зладзеянне і з такім-жа халоднакроўем ажыццявілі яго.

Аб тым, як арудавалі гэтыя каварныя ворагі, як яны, не пагарджаючы ніякімі сродкамі, дабіваліся ажыццяўлення злачынных замыслаў, падрабязныя паказанні суду даў на ранішнім пасяджэнні 8 сакавіка падсудны Левін.

Левін поўнасцю пацвярджае сваю віну ў цяжкіх злачынствах. Аднак ён прабуе стаць перад судом толькі ў якасці «сляпой зброі» Ягоды. Допыт паказвае, што Левін актыўны арганізатар забойстваў. Скарыстоўваючы сваё становішча ўрача, ён свядома пайшоў на ўмярцвенне лепшых совецкіх людзей, пасля таго, як Ягода абвясціў яму аб тым, што гэта патрэбна антысовецкай бандзе, узначальваемай Троцкім, Рыкавым, Бухарыным. На працягу некалькіх год Левін выконваў страшэнныя заданні Ягоды. Адказваючы на пытанне дзяржаўнага абвінаваўцы тав. Вышынскага, Левін вымушан прызнацца ў тым, што ён дзейнічаў як палітычны вораг совецкай улады, у поўнай меры ўсведамляў, што справа ідзе аб барацьбе з совецкай уладай.

Левін пазнаёміўся з Ягодай яшчэ ў пачатку 20-х гадоў і з таго часу іх сувязь прадаўжала ўмацоўвацца.

Больш цесная дружба началася з 1928 года, калі падсудны стаў пастаянным урачом Алексея Максімавіча Горкага і, па ўласнаму прызнанню, сваім чалавекам у доме Горкага. Ужо тады Ягода пачаў праяўляць да Левіна выключную ўвагу. Гэта ўвага выразілася ў тым, што Ягода пасылаў доктару Левіну кветкі, дарагое французскае віно і падарыў нават... дачу. Левін меў права, вяртаючыся з заграпічных паездак, правозіць без пошліны ўсё, што хацеў. Грубейшае парушэнне совецкага закона, ашуканства дзяржавы Левін прымае як належнае. Ен ганарыцца давер'ем «незвычайнага пацыента», ён свядома ідзе на злачынства. І вось прыходзіць дзень, калі Ягода патрабуе аплаты па гэтаму рахунку «давер'я» і «ўвагі».

Алексей Максімавіч Горкі разам з сям'ёй прыязджае з Італіі на пастаяннае жыхарства ў Маскву. Аднойчы, у пачатку 1933 года, паміж Левіным і Ягодай адбылася размова аб сыне Горкага — Максіму. Ягода выказаў сваё незадаваленне паводзінамі маладога Пешкова, а пры наступнай сустрэчы пачаў ужо гаварыць аб тым, што Максім Пешкоў чалавек нікудышны, што ён «шкодна» дзейнічае на бацьку, які яго вельмі любіць, і што яго трэба ўбраць.

Вышынскі. Гэта значыць яго забіць?
Левін. Вядома.

Падсудны Левін хутка згадзіўся выканаць гэта гнуснае даручэнне Ягоды, спяшаецца знайсці сабе памочнікаў і хутка знаходзіць іх.

У гэты-ж час у Ягоды ўзнікае новы злачынны план: ён даручае Левіну пакончыць з хворым Менжынскім. Левін кліча на дапамогу Казакова.

Подлыя змоўшчыкі прыступаюць да ажыццяўлення гнуснага замыслу. Левін і Кручкоў ствараюць для Максіма Пешкова такія ўмовы, што ён захворвае крупозным запаленнем лёгкіх. Яны ўжываюць шкодніцкія метады лячэння. Хвораму Менжынскаму Левін і Казакоў даюць лякарствы ў такіх спалучэннях, што яны робяцца ядам, падрываюць яго апошнія сілы. І вось амаль адначасова, 10 і 11 мая 1934 года, чэкіст Менжынскі і сын Горкага — Максім Пешкоў гінуць, умярцвёныя па ўказцы Ягоды.

Права-трацкісцкая банда патрабуе новых афяр. Ягода прапануе сваім падручным выканаць новыя злачынныя акты — умярцвіць членаў Палітбюро ЦК ВКП(б). У адказ на прапанову Ягоды Левін сам называе імя Валерыяна Владзіміравіча Куйбышэва, якога ён лячыў на працягу многіх год і ста- здароўя якога добра ведаў. «Права-трацкісцкі блок» ставіць адначасова задачу — устараніць Алексея Максімавіча Горкага, геніяльнага пісьменніка, небяспечнага для змоўшчыкаў. Спакойным голасам падсудны Левін дае паказанні суду аб тым, як быў забіт Куйбышэў. Разам з Плетнёвым і сакратаром Куйбышэва Максімавым-Дзікоўскім Левін зноў ужыў шкодніцкія метады лячэння. Гэтак-жа ён паступае з Алексеем Максімавічам Горкім. Ва ўмярцвенні пісьменніка актыўны ўдзел прымае падсудны Кручкоў. Злейшыя ворагі атруцілі любімага сына вялікага рускага народа.

Зварачаючыся да падсуднага, Дзяржаўны абвінаваўца тав. Вышынскі пытае:

— Колькі гадоў прадаўжаўся ваш удзел у гэтай злачыннай дзейнасці?

— Тры гады, — адказвае Левін.

— Тры гады! За гэты час Левін меў тысячы магчымасцей выкрыць Ягоду, паступіць як чэсны совецкі грамадзянін, але ён не зрабіў гэтага, не скарыстаў сваіх магчымасцей.

Дастойны паплечнік прадажнікаў і здраднікаў з права-трацкісцкай банды, урач, які свае веды накіроўваў на шкоду совецкаму народу і цяпер сядзіць на лаве падсудных за найцяжэйшыя злачынствы, — такі абвінавачваемы Левін.

***

Пачынаючы з ранішняга пасяджэння 8 сакавіка, на судзе ў якасці медыцынскіх экспертаў прысутнічаюць: заслужаны дзеяч навукі праф. Н. А. Шэрашэўскі, заслужаны дзеяч навукі праф. Д. А. Бурмін, прафесар В. Н. Вінаградаў, прафесар Д. М. Расійскі, доктар медыцынскіх навук В. Д. Зіпалаў.

Дзённік вячэрняга пасяджэння 8 сакавіка

Вячэрняе пасяджэнне Ваеннай Калегіі Вярхоўнага Суда СССР 8 сакавіка пачынаецца допытам былога сакратара Ягоды, падсуднага Буланава. Буланаў паведаміў, што яму былі вядомы ўдзел Ягоды ў змове «права-трацкісцкага блока», у забойстве С. М. Кірава, арганізацыя Ягодай умярцвення В. Р. Менжынскага, В. В. Куйбышэва, А. М. Горкага і М. А. Пешкова. З допыту падсуднага Буланава высняецца, што Ягода і Буланаў прабавалі таксама атруціць таварыша Н. І. Ежова.

Суд пераходзіць да допыту Ягоды, які прызнае свой удзел у арганізацыі гэтых злачынных забойстваў, а таксама замах на жыццё таварыша Н. І Ежова. Падсудны Ягода прызнаў, што ў НКВД «працавала» пад яго апякунствам група шпіёнаў замежных дзяржаў. Ягода таксама прызнаў, што ён не раз пасылаў грошы за граніцу Троцкаму.

Дапытаны ў канцы вячэрняга пасяджэння падсудны Кручкоў прызнаў свой удзел ва ўмярцвенні А. М. Горкага і М. А. Пешкова.

***

Падрабязны дзённік вячэрняга пасяджэння Ваеннай Калегіі Вярхоўнага Суда СССР будзе змешчаны ў наступным нумары газеты.

ПОДЛЫМ ФАШЫСЦКІМ НАЙМІТАМ АДЗІНЫ ПРЫСУД—РАССТРЭЛ!

СМЕРЦЬ ФАШЫСЦКІМ ІУДАМ!

Адзін за адным устаюць перад судом страшныя здані мінулага. Здаецца, паварушылі могілкі разбітага намі і даўно пахаванага ў нашай краіне старога капіталістычнага свету. І з струхнелых магіл выйшлі недабітыя пачвары — ахраннікі, правакатары, шпіёны, забойцы, майстры атрутных спраў, гандляры радзімай, гандляры рабочай крывёй, гандляры чалавечым сумленнем, іудушкі і іуды, лізаўшыя фашысцкі бот за фашысцкія срэбранікі. Імя ім — мерцвякі. І выступленні іх — апошнія патугі недабітых рэштак гнілой спадчыны мінулага.

Забойцы Менжынскага, Куйбышэва, Кірава, забойцы светлага і неўміручага ў памяці людской Аляксея Максімавіча — хіба можна знайсці звычайныя чалавечыя словы, каб выразіць усю глыбіню нашай нянавісці да вырадкаў людской сям'і, да ўсіх гэтых рыкавых, бухарыных, шаранговічаў, ягодаў і ўсёй іншай фашысцкай блявоціны.

А яны-ж думалі распасцерці свае брудныя крывавыя лапы над галовамі лепшых сыноў нашай радзімы, пасягалі на жыццё адданейшых і любімейшых правадыроў вялікага совецкага народа і нашай дзяржавы...

Яны думалі і наш беларускі народ аддаць у крывавыя лапы польскай шляхты, гэтых адвечных ворагаў рускага, украінскага і беларускага народаў. Рукамі Шаранговіча і яго прысных яны руйнавалі вялікія здабыткі беларускага народа, падрывалі яго гаспадарку, яго культуру.

Смерць-жа здраднікам, смерць фашысцкім іудам! Жалезнай мятлой змяцём гэтае паганае смецце з чыстай падлогі нашага светлага, сонечнага совецкага дома.

МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ.

ІХ БРУДНЫЯ ІМЁНЫ БУДУЦЬ ПРАКЛЯТЫ УСІМ ЧАЛАВЕЦТВАМ

Восем дзён засядае Вярхоўны совецкі суд, восем дзён ён разблытвае змяіныя хады брудных і агідных у сваёй мерзасці ворагаў народа. І восем дзён уся наша краіна з невымоўнай нянавісцю сочыць за лаўкай падсудных. Калі канчаецца допыт аднаго з падсудных, які гандляваў крывёю лепшых сыноў народа яшчэ да рэволюцыі, а потым паставіў сабе стаж правакатара ў партыйны стаж,—здаецца, што знойдзена мяжа агіднаму на зямлі. Але пачынае гаварыць другі — і гэтая мяжа адыходзіць яшчэ далей; ён умудрыўся шалёнай слінай пераплюнуць сваіх саўдзельнікаў па здрадзе.

У іх ніколі не было нічога святога, усё было прадажным: словы, сумленне, бацькаўшчына. Яны згнілі, разлажыліся да канца, так што фізічнае знішчэнне іх — бухарыных, рыкавых, шаранговічаў і іншых шалёных сабак фашызма — адзіны лагічны канец, адзіная адплата.

Яны шкодзілі дзе толькі маглі, куды даставалі іх рукі: прадавалі радзіму, атручвалі жывёлу, кідалі пад адхон паязды з людзьмі, давалі шкодніцкія ўстаноўкі ў літаратуры, у мастацтве, насаджвалі і падтрымоўвалі сваіх людзей — нацыянал-фашыстаў, шпіёнаў, дыверсантаў, разлажыўшыхся вырадкаў, чаротаў, галавачоў, браншгэйнаў. Яны знішчалі партыйныя кадры. Яны забілі нашу гордасць і славу — вялікага Горкага! Яны рыхтавалі мільёны смерцяў для працоўных Совецкага Саюза, для іх дзяцей. Чым адкажа мерзкі Каін — Троцкі перад гісторыяй, чым адкажуць гэты Іуда і яго падручныя перад чалавецтвам?

Смерці, самай лютай і ганебнай, здаецца мала для іх за іх подлыя ўчынкі. Імёны Троцкага — обершпіёна і здрадніка, Бухарына і іншай сволачы, якая сядзіць на лаўцы падсудных, будуць праклягы ўсім чалавецтвам, і брудныя цені іх стануць сінонімам самага агіднага, самага подлага, што толькі было на зямлі.

Няхай ведаюць усе ворагі нашай радзімы, што не пахісне яе — магутную радзіму совецкіх народаў — ніякая здрада, ніякія ворагі і што пролетарскі меч расшчэпіць галаву хоць якому гаду, які пасягне — будзь гэта знутры ці звонку — на нашы правы, на нашы дасягненні, на нашу радзіму і яе правадыра.

М. КЛІМКОВІЧ.

РАССТРАЛЯЦЬ!

Адзін час сусветны друк быў перагоўнены навінамі пра жахлівыя злачынствы вядомага амерыканскага бандыта Аль-Капонэ. Але ў параўнанні з тымі бандытамі, якіх вылавіла слаўная совецкая разведка і якія цяпер даюць адказ Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР, памянёны чыкагскі галаварэз — проста нікчэмнасць і крокті ангел.

З грубай і цынічнай развязнасцю, прыпёртыя доказамі і фактамі да сцяны, апавядаюць яны пра свае крывавыя дзеянні і планы. Подлыя забойцы лепшых і праслаўленых на ўвесь свет сыноў вялікага совецкага народа — Кірава, Менжынскага, Куйбышэва, Горкага, яны хацелі заліць крывёю рабочых і сялян краіну, якая ўжо дваццаць год пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна квітнее шчасцем і радасцю мірнай працы.

Страціўшы ўсякае чалавечае аблічча, гэтыя мярзаўцы хацелі прадаць Украіну немцам, Беларусь палякам, Узбекістан англічанам, Прымор'е японцам. Яны хацелі адабраць ад сялян і вярнуць памешчыкам зямлю, вярнуць фабрыкі і заводы капіталістам.

Нічога не выйшла і не выйдзе ў гэтых крывавых паноў! Ніколі ўжо не быць акупанцкаму боту на свабоднай зямлі маёй слаўнай радзімы! Ніколі ўжо не кранецца панскі бізун спіны свабоднага, шчаслівага совецкага чалавека!

Беларускі народ добра памятае «рыцараў Захаду», якія па запрашэнню крывавых нацыянал-фашыстаў два разы ўрываліся ў нашу краіну. Зруйнаваныя дашчэнту гарады, сотні спаленых мястэчак і вёсак, тысячы расстраляных рабочых і сялян — вось які след застаўся пасля нямецкіх і польскіх акупантаў.

Успамінаючы пра ўсе гэтыя здзекі, у якія зноў хацелі кінуць совецкі народ подлыя з подлых бухарыны, рыкавы, шаранговічы і іншыя шпіёны і гандляры радзімай, у нас узнікае толькі адно патрабаванне да Вярхоўнага суда —

— расстраляць гэтых фашысцкіх сабак усіх да аднаго!

М. ПАСЛЯДОВІЧ.

БАНДЫТЫ НЕ МАЮЦЬ ПРАВА ЖЫЦЬ!

Гісторыя не ведала здрадніцтва, падобнага гнуснай, мерзкай авантуры кампаніі «Троцкі—Бухарын—Рыкаў з прыспешнікамі».

Словы Радзіма, Рэволюцыя для гэтых мярзаўцаў існуюць у нейкім іншым, скажоным разуменні.

Што можа быць злачынней здрадніцтва радзіме?

Непераможная Чырвоная Армія ў баях за шчасце свайго народа прайшла ад берагоў Віслы да Ціхага акіяна, пакінуўшы на палях радзімы сляды сыноўняй крыві, і гэтыя сляды крыві, святыя сляды крыві воінаў рэволюцыі, социял-фашысцкія наймiты хацелі затаптаць салдацкім ботам фашысцкай інтэрвенцыі, адабраць у народа яго шчасце, радасць шчаслівага сталінскага жыцця.

Мышленне не ўспрымае ўсёй велізарнай пачварнасці рыхтаваўшайся чорнай справы.

«Палітычныя» ігракі ў рулетку не разлічылі хода. Нельга, арганічна немагчыма адабраць у совецкага народа яго радзіму.

На варце сталінскага светлага жыцця—слаўныя чэкісты пад кіраўніцтвам таварыша Ежова, іх пільнасць — гарантыя ад пасягацельства падляцоў.

Ніякага іншага прыгавору трацкісцка-бухарынска-рыкаўскім бандытам, як прыгавор «да расстрэлу».

Бандыты не маюць права жыць!

Улад. ГЛАЗЫРЫН.

ДАЛУЧАЕМСЯ ДА ГОЛАСУ ЎСЯГО НАРОДА

Калектыў Дзяржаўнага беларускага драматычнага тэатра далучаецца да голасу шматмільённага народа Совецкага Саюза, патрабуючы бязлітаснага прыгавору бандзе фашысцкіх наймітаў, змоўшчыцкай групе «права-трацкісцкага блока», гэтай агіднай зграі заклятых ворагаў совецкага народа, якая ставіла сабе мэтай звяржэнне існуючага ў СССР социялістычнага грамадскага і дзяржаўнага ладу, аднаўленне капіталізма, аднаўленне ўлады буржуазіі.

Рыхтуючы плацдарм для нападу фашысцкіх агрэсараў на Совецкі Саюз, гэтая злачынная зграя чалавечых вырадкаў не спынялася перад самымі жудаснымі забойствамі і іншымі дыверсійнымі актамі ў сваёй барацьбе. Ад подлых рук гэтых бандытаў загінулі лепшыя людзі нашай краіны—тт. Кіраў, Куйбышэў, Менжынскі, М. Горкі. Рознымі способамі здзекваючыся з народа, гэтыя правакатары і шпіёны стараліся сваёй агіднай дзейнасцю выклікаць незадаволенне існуючым ладам. Але пільнасць совецкага народа, пільнасць органаў НКВД, кіруемых любімым наркомам тав. Ежовым, дапамагла своечасова выкрыць варожыя планы гэтых бандытаў.

Ставячы перад сабой задачу стварыць спектакль, у якім паказаць народу подлы твар ворага, працаўнікі Белдзяржрамтэатра абавязваюцца яшчэ больш узмацніць пільнасць у сваім калектыве, шырэй разгарнуць сваё палітычнае выхаванне, абаронную работу, — гэтым самым узмацніць магутнасць нашай краіны, яе непрыступнасць для ворагаў, якія ўсімі способамі імкнуцца напасці на нашу шчаслівую бацькаўшчыну.

Няхай жыве наш любімы нарком тав. Ежоў і слаўныя совецкія разведчыкі, верныя вартавыя заваёў рэволюцыі!

Няхай жыве наша непераможная Чырвоная Армія і яе жалезны нарком маршал Клім ВАРАШЫЛАЎ!

Няхай жыве наша родная комуністычная партыя і правадыр працоўных усяго свету вялікі СТАЛІН!

Калектыў Белдзяржрамтэатра.

СЛАВА СОВЕЦКАЙ РАЗВЕДЦЫ

Усю моц свайго гневу і нянавісці абрушыў совецкі народ на галовы двуногіх звяроў — гэтых здраднікаў, шпіёнаў і забойцаў, пасягаўшых на радаснае социялістычнае жыццё нашай вялікай радзімы, на жыццё любімых і лепшых сыноў працоўнага чалавецтва, на генія чалавецтва вялікага Сталіна.

Пролетарскі суд, перад якім прадсталі фашысцкія бандыты, — ёсць суд усіх народаў дружнай социялістычнай сям'і вялікага Совецкага Саюза над сваімі ворагамі! Няхай ведаюць тройчы праклятыя падпальшчыкі войнаў і душыцелі культуры, распальшчыкі расавай і нацыянальнай варожасці, што ні адзін з іх не будзе жыць на свабоднай зямлі свабодных народаў.

Няхай ведаюць фашысты, гэтыя алкіды чалавецтва, што ім ніколі не ўдасца разбіць згуртаваную социялістычную сям'ю свабодных народаў Совецкага Саюза, ім ніколі не ўдасца ступіць нагой на нашы землі.

Смерць фашысцкім забойцам!

Л. РАХЛЕНКА.
Заг. мастацкай часткай Белдзяржтэатра.

НІЯКАЙ ЛІТАСЦІ БАНДЗЕ ФАШЫСЦКІХ НАЙМІТАЎ

Калі ўважліва сочыш па газетах за працэсам над ворагамі народа, над гэтай подлай зграяй фашысцкіх наймітаў і забойцаў—Рыкавым, Бухарыным, Ягодай, Шаранговічам і іншымі, бура абурэння ўздымаецца ў грудзях. Агіднейшыя фашысты-забойцы Шаранговіч, Галадзед, Чарвякоў, Чарнушэвіч імкнуліся прадаць нашу радзіму замежнаму фашызму.

Цяпер зразумела, што гэтая зграя, раскінуўшы свае шчупальцы па ўсіх прадпрыемствах, імкнулася затармазіць рост нашай рэспублікі ва ўсіх яе звеннях. Цяпер зразумела, чаму і мастацтва нашай рэспублікі не злолела да гэтага часу стаць на адзін узровень з мастацтвам другіх брацкіх рэспублік.

Але не ўдалася подлым наймітам фашызма прывесці ў жыццё свой агіднейшы намер: яны прадсталі перад пролетарскім судом.

Ніякай літасці бандзе фашысцкіх наймітаў!

Я заклікаю ўсіх работнікаў мастацтва ўсімі сіламі дапамагаць нашай партыі і ўладзе ліквідаваць рэшткі шкодніцтва, якое насаджалася агіднымі здраднікамі, і ўзнімаць мастацтва нашай рэспублікі на ўзровень, варты сталінскай эпохі.

Л. І. РЖЭЦКАЯ.
Артыстка Белдзяржрамтэатра.

ЗНІШЧЫЦЬ ПОДЛЫХ ГАДАЎ!

Заслухаўшы паведамленне аб працэсе над контррэволюцыйным «права-трацкісцкім блокам», калектыў Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР выказвае свой гнеў і абурэнне з прычыны нечуваных злачынстваў шалёных фашысцкіх сабак — Троцкага, Бухарына, Рыкава і кампаніі. Гэта подлая банда забойцаў ставіла сваёй мэтай знішчэнне СССР, прадалася фашысцкім агрэсарам, шляхам шпіянажу, дыверсій, шкодніцтва, тэрарыстычных актаў хацела падарваць нашу магутнасць. Гэтыя гнусныя падонкі хацелі расчляніць вялікі Совецкі Саюз, дагаварваліся з фашысцкімі агрэсарамі аб адрыве ад СССР Украіны, Беларусі, Грузіі, Арменіі, Сярэдне-Азіяцкіх рэспублік.

«Права-трацкісцкі блок» вёў сваю падрыўную работу на рэстаўрацыю капіталізма, на знішчэнне дзяржавы рабочых і сялян. Гэта подлая банда забіла лепшых сыноў нашай радзімы, бліжэйшых саратнікаў Леніна і Сталіна тт. Кірава, Куйбышава, Менжынскага і вялікага класіка пролетарскай літаратуры А. М. Горкага.

Гнусныя агенты фашызма — Іуда-Троцкі, Бухарын, Рыкаў і іншая сволач гэтага блока хацела затапіць у моры крыві нашу социялістычную радзіму, аддаць каштоўнае жыццё нашых рабочых, сялян і совецкай інтэлігенцыі на знішчэнне фашысцкім разбойнікам.

Але яны пралічыліся. Пільныя сыны нашай радзімы — слаўныя работнікі органаў НКВД на чале з лепшым вучнем вялікага Сталіна Ежовым пільна сочаць за падкопамі каварнага ворага. Вораг узяты за горла яжовымі рукавіцамі. Увесь совецкі народ з'яўляецца памочнікам слаўных органаў НКВД. Няхай запомняць гэта фашысцкія псы. Увесь совецкі народ гатовы да апошняй кроплі крыві абараняць сваю социялістычную радзіму, увесь совецкі народ да канца адданы партыі Леніна—Сталіна, яе геніяльнаму кіраўніку, роднаму таварышу Сталіну.

Мы патрабуем ад совецкага правасуддзя знішчыць подлых гадаў—агентаў фашысцкага гестапо Бухарына, Рыкава, Шаранговіча і іншую нечысць гэтага блока, сцерці з твару зямлі наёмных фашысцкіх забойцаў. Мы заяўляем нашу партыю і ўрад, што па першаму закліку партыі і роднага правадыра таварыша Сталіна усе, як адзін, станем на абарону нашай любімай радзімы.

Няхай жыве наш любімы друг, бацька і настаўнік, наш родны таварыш СТАЛІН!

Калектыў Яўрэйскага дзяржтэатра БССР.

ПІСЬМЕННІК Ул. ГЛАЗЫРЫН УЗНАГАРОДЖАН МЕДАЛЛЮ „XX год РСЧА“

Нарадзіўся тав. Глазырын у 1901 годзе. Бацька яго быў рабочы і загінуў на пажары. Сірата Валодзя вучыўся ў рэальным вучылішчы бясплатна, як сын нябожчыка, загінуўшага ў часе катастрофы, а калі падрос — працаваў на земляных работах на чыгунцы.

Кастрычніцкая соцыялістычная рэвалюцыя зрабіла пералом у жыцці Валодзі.

Адразу пасля арганізацыі Чырвонай Арміі 17-гадовы Валодзя Глазырын уступіў добраахвотнікам у яе рады, каб побач з братамі па класу абараняць свае фабрыкі, заводы, шахты, сваю зямлю ад азвярэлых банд інтэрвентаў.

Першае баявое хрышчэнне тав. Глазырын атрымаў у жорсткіх баях з калчакаўцамі. Знаходзячыся ў радах слаўнай 30-й стралковай дывізіі, ён змагаўся з ворагам спачатку радавым байцом, а потым камандзірам узвода разведчыкаў.

Пасля канчатковага разгрому калчакаўскіх банд тав. Глазырын састаяў у складзе 8-й стралковай дывізіі і ў часцях 16-й арміі, якія геоаічна змагаліся з белапольскімі акупантамі на Заходнім фронце.

Чырвоная Армія вырасціла і выхавала тав. Глазырына. Яна была для яго непараўнальнай школай барацьбы за народнае шчасце, школай палітычных, літаратурных ведаў. У арміі ён рос культурна, выпрацаваў у сабе выключную дысцыплінаванасць, акуратнасць.

З 1934 года тав. Глазырын пачаў працаваць у літаратуры. За гэты час ён напісаў п'есы «Фронт», «Маладая сіла», «Выбух», рад апавяданняў аб грамадзянскай вайне, аповесць для дзяцей («Маленькі разведчык») і інш.

У адзнаку выдатнага юбілея — дваццацігоддзя РСЧА тав. Глазырын Ул. Н. указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР узнагароджан медаллю «XX год РСЧА».

ПАЕЗДКІ АНСАМБЛЯ ПЕСНІ І ПЛЯСКІ

Гэтымі днямі з паездкі ў Бабруйск і Гомель вярнуўся ансамбль песні і пляскі Дзяржфілармоніі пад кіраўніцтвам Алексютовіча і Сакалоўскага.

За трынаццаць дзён ансамбль даў васемнаццаць канцэртаў, у тым ліку чатыры для чырвонаармейскіх часцей у парадку культшэфства. Канцэрты ансамбля мелі ўсюды выключны поспех.

У Бабруйску на адным з канцэртаў у Доме Чырвонай Арміі прысутнічаў дэпутат Вярхоўнага Совета Герой Совецкага Саюза тав. Дзенісаў. Пасля канцэрта тав. Дзенісаў правёў з калектывам ансамбля гутарку аб ролі і задачах прапаганды беларускай народнай творчасці.

У плане работы ансамбля — паездка ў Маскву, а таксама паездка ў Малдаўскую рэспубліку.

ПРАГРАМЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ДЛЯ СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЫ ПАТРАБУЮЦЬ ПЕРАПРАЦОЎКІ

Сярэдняя школа БССР да гэтага часу не мела больш-менш здавальняючай праграмы па роднай мове. Існаваўшыя праграмы па беларускай мове не задавальнялі патрабаванняў совецкай школы: яны былі засмечаны шкоднымі ўстаноўкамі аб паходжанні і развіцці беларускай мовы, не мелі стройнай, вытрыманай сістэмы, чым пазбаўлялі нашых вучняў магчымасці глыбока аўладаць сучаснай літаратурнай мовай, мець цвёрдыя навыкі ў арфаграфіі і дасканалыя веды па граматыцы.

Здавалася-б, што Наркамасветы БССР павінен гэта ўлічыць і, урэшце, выдаць праграмы па беларускай мове для сярэдняй школы і педагагічных вучылішчаў, якія-б (праграмы) поўнасцю адпавядалі пастановам партыі і ўрада аб стабільных праграмах і падручніках.

З гэтым НКА БССР покуль-што не справіўся: праграмы па беларускай мове для педагагічных вучылішчаў яшчэ зусім няма, а вышаўшая з друку праграма па беларускай мове для сярэдніх школ мае цэлы рад істотных недахопаў.

З першага погляду кідаецца ў вочы, што гэта праграма зроблена наспех, без уліку ўзросшых патрабаванняў настаўніка і вучняў да асваення літаратурнай мовы, да глыбокага вывучэння граматыкі і поўнай ліквідацыі ганебнага з'явішча ў школе — бязграматнасці.

Пастараемся ўказаць на заўважаныя намі недахопы праграмы.

У паясняльнай запісцы да праграмы гаворыцца аб мове літаратурнай і размоўнай, аб дыялектах беларускай размоўнай мовы (праўда, гэтыя дыялекты канкрэтна не ўказаны), але праграма зусім цмяна спыняецца на генезісе літаратурнай мовы, накіроўваючы ўвагу толькі на яе функцыі, і зусім абыходзіць пытанне вывучэння размоўнай мовы рабочых і калгаснікаў, вывучэння мовы совецкага фальклору. Гэта, безумоўна, з'яўляецца штучным адрывам літаратурнай мовы ад мовы шырокіх працоўных мас беларускага народа.

Асобныя раздзелы праграмы па граматыцы маюць цэлы рад недакладнасцей, блытаных фармулёвак. Так, у раздзеле сінтакса простага сказу зусім не адзначаецца вучэнне аб двухскладнасці і аднаскладнасці простага сказу, а ў паясняльнай запісцы даволі глуха сказана, што трэба прывучаць дзяцей разбіваць сказ на дзве групы, г. зн. разбіваць сказ на лагічны дзейнік і выказнік. У відах простага сказу ў адносінах да дзейніка і выказніка (праграма чамусьці іх называе тыпамі) зусім адсутнічаюць неазначальна-асабовыя і абагульнена-асабовыя сказы, якія ў практычнай рабоце многія настаўнікі па неразуменню адносяць да безасабовых сказаў.

Няма чоткасці ў праграме і па даданых членах сказу, якія вельмі часта ў праграме адзначаюцца агульным тэрмінам паясняльных слоў. Праўда, у праграме ўведзены тэрміны дапаўнення, азначэння, акалічнасці, але сінтаксічнаму разбору ды і самім фармулёўкам гэтых граматычных катэгорый, відаць, не надаецца асаблівага значэння, бо ў паясняльнай запісцы да праграмы аб гэтым нічога агульнага не сказана, а варта было-б гэта адзначыць, бо яшчэ і зараз сярод выкладчыкаў мовы існуе вялікі разнабой у правядзенні сінтаксічнага разбору, і, сапраўды, славеснік адзін другому паставіць не больш двойкі за сінтаксічны разбор.

Так, акалічнасць месца, сказана, адказвае на пытанні: дзе? куды? адкуль? Але патрэбна да гэтай акалічнасці дадаць яшчэ адно пытанне — дакуль? Акалічнасць прычыны — чаму? адчаго? Патрэбна дадаць пытанне — па якой прычыне? Акалічнасць спосабу дзеяння — як? якім чынам? Патрэбна яшчэ дадаць—колькі разоў? у якой меры? Праграмай зусім абыйдзены такія прыклады пры сінтаксічным разборы, як: «у **цішыні** раздаўся выстрал. У **ценю** добра адпачываць». Патрэбна растлумачыць, да якой акалічнасці адносяцца словы «у цішыні», «у ценю». А такіх прыкладаў у літаратурнай мове вельмі багата.

У праграме адзначаюцца толькі простыя і састаўныя выказнікі. Праграмай зусім абыходзяцца складаны і падвойны выказнікі, якія ў мове ёсць, і пры разборы іх часта зусім няправільна адносяць да састаўнога выказніка. Вось прыклады: «**І стане расказваць** дзед аб мінулым». Стане расказваць — складаны, а не састаўны выказнік. Альбо: «**Я пайду пагуляю. Сяду пачытаю**». Пайду пагуляю, сяду пачытаю—нельга аднесці да састаўнога выказніка. Гэта падвойныя выказнікі.

У раздзеле сінтакса складанага сказу робіцца падзел даданых сказаў па іх значэнню на 9 відаў: адзначальныя, дапаўняльныя, умоўныя, прычынныя, мэты, часу, месца, параўнальныя і ўступальныя сказы. Нам здаецца, патрэбна было-б увесці яшчэ дзесяты від сказу—із'ясняльныя сказы, якія з'яўляюцца вынікам, рэзультатам таго, аб чым гаворыцца ў галоўным сказе. Напрыклад: «Хацінку так занесла снегам, **што вакон не відаць**. За ноч усе добра адпачылі, **так што раніцай можна было з падвойнай энергіяй прыняцца за работу**». Прыведзеныя сказы ні да аднаго з дзесяці пералічаных у праграме аднесці нельга.

Здзіўляе і тое, што праграмай абыйдзены дыялаг і перыяд. Ігнараваць перыядычную мову нельга, бо яна ёсць як у мастацкіх творах пісьменнікаў, так і ў аратарскай мове таварышоў Леніна і Сталіна.

Асабліва наспех накідана праграма па граматыцы для 8, 9 і 10 класаў сярэдняй школы. Ніякай сістэмы ў праграме для гэтых класаў няма. Аўтар праграмы сцвярджае, што «План заняткаў па беларускай мове ў 8—10 класах будуецца на аснове адных і тых-жа прынцыпаў, бо падрыхтоўка вучняў гэтых класаў у галіне граматнасці знаходзіцца на аднолькавым, прыблізна, узроўні». Гэта сцвярджэнне, безумоўна, няправільнае і нават шкоднае. Ажыццяўляючы практычна сваё сцвярджэнне, аўтар праграмы дае для 8, 9 і 10 класаў адзін і той-жа праграмны матэрыял, увёўшы толькі для 8 класаў элементы мовазнаўства і гісторыі мовы.

У апошніх класах сярэдняй школы патрэбна пашырыць і паглыбіць веды па граматыцы, увязаўшы гэта з элементамі мовазнаўства і гісторыі мовы, бо ў праграме гэты раздзел надзвычай агульна адзначан. Напрыклад, гаворыцца аб дыялектах размоўнай мовы, але канкрэтна гэтыя дыялекты не ўказваюцца, нават не ўказваецца агульная літаратура па мовазнаўству для настаўніка.

Раздзел праграмы па развіццю мовы яшчэ горш распрацаваны. Творчыя работы маюць велізарнае значэнне для ўзбагачэння лексікона вучняў, вобразнасці мовы, разумення мастацкіх сродкаў яе. Сістэматычнае і правільнае правядзенне творчых работ, паступовае іх ускладненне дае значны эфект у аўладанні вучнямі культурай мовы. Але ў праграме назіраецца бессістэмнасць і беднасць творчых работ для паасобных гадоў навучання. Напрыклад, у 5 класе пад загалоўкам «Аналіз тэкста» пералічаны такія творчыя работы (вусныя ці пісьмовыя — не ўказана): пераказ і ўкладанне; укладанне творчага характару (выпадкі з жыцця школы, вучняў, піонерлагера і т. д.). У 6 класе — апавядальныя ўкладанні; у 7 — укладанне вучнямі больш складаных, чым у 6 класе, тэкстаў тыпу апісанняў; 8 клас — пісьмовыя ўкладанні на літаратурныя тэмы тыпу характарыстык; 9 і 10 класы — параўнальныя характарыстыкі.

З прыведзенага відаць, што разнастайнасць творчых работ укладальнікамі праграмы не ўлічана, што не адзначаны цэлы рад цікавых і займальных творчых работ, якія практыкуюцца ў школе. Напрыклад, такія творчыя работы, як пераказ, даюцца толькі ў 5 класе, у той час, калі іх патрэбна ужываць у 6—7 і нават у 8 класах. Творчыя работы па пачатку і канцу зусім не адзначаны ў праграме. Трэба было-б канкрэтызаваць і апісанні прыроды тыпу «Лес» з такімі, прыблізна, пунктамі плана: лес раніцай, лес удзень, лес увечары.

Разам з літаратурнымі характарыстыкамі патрэбна было-б увесці ў праграму такія творчыя работы, як літаратурны партрэт, а для 9 і 10 класаў неабходна было-б увесці сачыненні на гісторыка-літаратурныя і філасофскія тэмы.

Аўтар праграмы адзначае, што патрэбна ў школе весці рашучую барацьбу за чыстату мовы ў ленінска-сталінскім разуменні. Але чамусьці ў праграме ўжыты штучны тэрмін — **трыванні** дзеі слова. А чаму не **віды**? — усім вядомы тэрмін як у рускай, так і ў беларускай мове.

Наогул, стыль праграмы па беларускай мове не з'яўляецца ўзорам для настаўнікаў.

Адзначыўшы асобныя недахопы праграмы па беларускай мове, патрэбна зрабіць вывад. Праграму патрэбна перапрацаваць у напрамку большай сістэматызацыі праграмнага матэрыялу па граматыцы, удасканалення асобных граматычных катэгорый і большай канкрэтызацыі і сістэматызацыі раздзелу развіцця мовы.

М. Н. КАРПАЧОЎ.

Ленінградская майстэрня мастацкага ліцця падрыхтавала бронзавыя скульптуры для другой чаргі Маскоўскага метрапалітэна імя Л. М. Кагановіча.
НА ЗДЫМКУ: скульптуры работы заслужанага дзеяча мастацтваў праф. **М. Г. Манізера** (злева направа), «Партызан», «Фізкультурніца», «Дзяўчына з кнігай» і «Пагранічнік з сабакам».
Фото А. Сэкке (СФ).

НАД ЧЫМ МЫ ПРАЦУЕМ

Народны паэт Янка КУПАЛА

Што значыць — над чым я працую? Задаць такое пытанне паэту — рызыкоўна. Можна атрымаць адказ — «ні над чым», але можна і сказаць — «над усім».

Мы жывем у такі час, калі амаль кожны дзень прыносіць падзеі вялікай палітычнай важнасці. І абавязак паэта, калі ён не хоча адарвацца ад жыцця, своечасова і высокамастацкімі творамі адгуквацца на ўсе гэтыя падзеі.

Ці-ж можна маўчаць, калі радыё разносіць па ўсяму свету паведамленне Пракуратуры Саюза ССР аб жудасных, кашмарных злачынствах фашысцкай банды шпіёнаў, дыверсантаў, забойцаў, агентаў царскай ахранкі, аб'яднаных у адной смярдзючай кучцы «права-трацкісцкага блока»?

І як шчаслівы паэт, калі ён можа ў той-жа дзень прачытаць на мітынгу гневу і нянавісці да гэтых адкідаў чалавецтва — свае вершы, у кожным радку якіх — праклён агідным здраднікам радзімы.

І ў гэтыя-ж дні — другая падзея сусветнага значэння: на радзіму вяртаецца геоаічная чацвёрка папанінцаў. Вяртаецца яна з свайго надзвычайнага дрэйфа не толькі поўнасцю выканаўшы план навуковых работ, але і яшчэ раз давёўшы ўсяму свету, хто такія большэвікі, натхнёныя на вялікія справы вялікім Сталіным.

Ці-ж можа паэт не адгукнуцца на іх радасны прыезд вершамі, вартымі гэтых вялікіх людзей?

Вось над чым, па сутнасці, я і працую.

А між іншым, у перапынках паміж адной паэтычнай успышкай і другой— я перакладаю «Кобзар» Тараса Шаўчэнкі для юбілейнага зборніка. Я пераклаў ужо каля пяці тысяч радкоў і мяркую перакласці яшчэ тысяч з пяць.

Народны паэт Якуб КОЛАС

Вельмі шмат часу за апошні перыяд у мяне забірае адміністрацыйная работа па Акадэміі навук БССР, што тармозіць і аддаляе выкананне раду маіх творчых замыслаў. Праўда, жыццё ў нас настолькі яркае і багатае, дае яно такую разнастайнасць тэм, што не адгуквацца на іх проста немагчыма. Аб гэтым гаворыць рад маіх вершаў на тэмы дня, надрукаваных за апошні час у газетах і журналах.

Апрача распрацоўкі бягучай тэматыкі, я прымаю ўдзел у падрыхтоўцы юбілейнага зборніка твораў Тараса Шаўчэнкі «Кобзар». Прадстаўлю пераклад двух тысяч радкоў вершаў Шаўчэнкі.

Выконваю абяцанне, дадзенае нашым піонерам: сабраў матэрыял для апавядання аб удзеле піонераў у ахове нашай дзяржаўнай граніцы.

Але ўжо даўно займае мяне думка аб напісанні твора на гістарычным матэрыяле Беларусі. Маю ўвагу запыняе паўстанне ў Крычаве ў 1740-43 гг., у якое было ўцягнута шмат людзей і якое каштавала працоўным шмат ахвяр. Крычаўскае староства тады належала князю Радзівілу, як падараванае яму польскім каралём. Купец крычаўскага староства Гдалій бярэ Крычаў на водкуп. Каб выбіць больш прыбытку, ён заводзіць цэлую сістэму налогаў і падаткаў, шырока выкарыстоўвае гандаль гарэлкай, спайвае беднату і закабальвае яе. Ён падрэзвае даходы папоў, становіцца канкурэнтам беларускіх купцоў і дробнай шляхты і выклікае нянавісць шырокага кола людзей. На чале руху супроць Гдалія становіцца яго канкурэнт — хопімскі купец беларус Васіль Вашчыла. Пачынаецца барацьба, у якую ўцягваюцца духавенства, дваранства, мяшчане, а потым і сяляне, войскі і г. д.

Перад аўтарам стаіць удзячная задача—на фоне гэтай гістарычнай абстаноўкі правесці ідэю барацьбы прыгнечанага працоўнага народа за сваё соцыяльнае вызваленне.

С. Дурылін

ЕРМОЛАВА

(Да 10-годдзя з дня смерці)

М. Н. Ермолава — гэта не проста вялікае імя, гэта — цэлая эпоха ў гісторыі рускага тэатра.

У тыя паўвека (1870—1921), калі яна была на сцэне, у рускім тэатры была цэлая плеяда надзвычайных артыстак: Федотава, Стрэпетава, Савіна, О. Садоўская, Лешкоўская, Камісаржэўская. Якія імёны, якія дараванні!

Але ў той час, калі кожная з гэтых выдатных артыстак упісала некалькі бліскучых старонак у гісторыю рускага тэатра, Ермолава напісала ў ёй цэлую кнігу.

У Ермолавай быў і нервовы ўздым Стрэпетавай, і благароднае майстэрства Федотавай, і прыгожы бляск Савінай, і глыбокая праўда О. Садоўскай, і яснасць Лешкоўскай, і шчыры лірызм Камісаржэўскай, — але ў ёй-жа было тое, чаго не было ні ў кім другім за ўсё стагоддзе рускага тэатра, — у ёй была геоаічная сіла трагедыйнай артысткі. Тое, што ў сучасніцах Ермолавай блішчэла асобнымі ўспышкамі каляровых агнёў (зграбнасць, яснасць, лірызм і г. д.), — спалучалася ў цудоўны спектр у ермолаўскім геніі і бліскучай радугай узносілася над панурай раўнінай рускай рэчаіснасці 1880—1900-х год. У сваім свабодным уздыме ўверх гэтая цудоўная радуга ермолаўскай творчасці была для лепшых людзей таго часу сімвалам перамогі над цёмнымі хмарамі жыцця і гісторыі, сімвалам прамяністага парыву да вызвалення, да свабоды.

«М. Н. Ермолава — гэта цэлая эпоха для рускага тэатра, гэта сімвал жаноцасці, прыгожасці, сілы, пафасу, шчырай прастаты і скромнасці. Яе даныя былі выключнымі. У яе была геніяльная чуласць, натхнёны тэмперамент, вялікая нервовасць, невычэрпныя душэўныя глыбіні». Гэта словы выдатнага сучасніка Ермолавай, які разам з тым ёсць наш сучаснік, — К. С. Станіслаўскага. А вось словы другога яе і нашага сучасніка, Вл. І. Неміровіча-Данчэнкі: Ермолава — гэта «самы выдатны тып рускай артысткі і жанчыны».

Усе, хто памятае Ермолаву, напэўна пацвердзяць адно агульнае ўсім уражанне. Калі прыязджалі ў Расію Россі, Сальвіні, Барнай, Пасарт і іншыя сусветныя артысты, мы аддаваліся ў іх уладу, мы пакараліся ім: роўных ім у Расіі не было, ці мы іх не бачылі. Але калі прыязджалі ў Расію Рэжан, Гіналдзі Ларэнцо, Сара Бернар, нават Дузе, — мы прызнавалі іх яркія дараванні, іх надзвычайнае майстэрства, але спакойна і горда гаварылі: «Але ў нас ёсць Ермолава». Ніхто з іх не быў вышэй за яе.

Як з Пушкіным руская муза паэзіі проста і дастойна ўступіла ў круг вялікіх сусветных паэтаў, так з Ермолавай руская муза трагедыі проста і дастойна ўвайшла ў рэдкі круг сусветных артыстаў.

У 1903 годзе Ермолава з велізарным поспехам іграла ролю Зейнаб у трагедыі А. І. Сумбатава «Здрада». Адной з самых патрасаючых сцэн была сустрэча гэтай былой царыцы, якая стала наложніцай заваявальніка Грузіі Солеймана, з старым селянінам Анапіяй Глаха (А. П. Ленскі). Стары выратаваў яе маленькага сына, выхаваў яго разам з сваім сынам, і цяпер, праз 20 год, прывёз да Зейнаб абодвух юнакоў. Ёй патрэбна пазнаць, каторы з іх яе сын, наследнік яе справы — помсты прыгнятальнікам радзімы. Не зводзячы палаючых вачэй іменна з яго, Ермолава працягла, ледзь чутна, пытаецца:

— «Каторы?»

Але яна пазнала ўжо яго, хоць не бачыла яго 20 год.

У яе пытанні гучыць і радасць маці, якая знайшла сына, і надзея жанчыны, якая благаслаўляе ў ім мсціўца за яе надруганую чэсць, і надзея дачкі свайго народа, якая бачыць у ім будучага кіраўніка паўстання супроць прыгнятальнікаў краіны, і, нарэшце, страх за тое, ці акажацца ён вартым вялікіх спраў, даручаемых яму маткай, народам, радзімай?

Усю гэту бездань пачуццяў, думак, надзей, адчуванняў, радасці і трывог Ермолава спалучыла ў адным слове: «Каторы?» — і спалучыла так, што глядзельная зала была скована тым глыбокім патрасеннем, выклікаць якое ў глядача ёсць лёс нямногіх вялікіх мастакоў.

Поспех Ермолавай у «Здрадзе» быў такі велізарны, што дайшоў да Сары Бернар: пазнаёміўшыся з трагедыяй Сумбатава, славутая артыстка пажадала сыграць ролю Зейнаб. У гутарцы з аўтарам, гаворачы кампліменты яго п'есе, Сара Бернар заявіла, што аднаго слова «Каторы?» недастаткова для перадачы тых складаных пачуццяў, якія хвалююць у гэты час Зейнаб, што тут неабходны маналог, таму што простае пытанне «Каторы?» не дае матэрыялу для ігры.

—Можа быць, і не дае, — ветліва згадзіўся аўтар «Здрады», — але Ермолавай, якая стварыла гэтую ролю ў Маскве, гэтага аднаго слова было дастткова, — і ён катэгарычна адмовіўся дапаўняць п'есу.

Гэта выдатны эпізод.

Ён выяўляе меру трагічнага генія Ермолавай.

Геоаічная сіла Ермолавай была такой магутнай, а глыбіня, шчырасць і паўната яе перажыванняў была такой бяздоннай, што ёй дастаткова было аднаго слова, каб гэтым словам «ударыць па сэрцах з няведамай сілай», — з сілай, якая аказалася цалкам «няведамай» і яўна недаступнай нават такой артысткі як Сара Бернар.

Недаступнай аказалася ёй і другая ўласцівасць Ермолавай: яе вялікая, сапраўды пушкінская прастата.

Ермолава, як ніхто, умела спалучыць у сваёй творчасці тое, што, як правіла, бывае рэзка раз'яднана ў тэатры: высокі пафас і бязмежную прастату. Яе геоаічны пафас быў такі вялікі, такі заразіцельны, такі прызыўны, што Ермолаву нездарма называлі трыбунам свабоды, які яднае сэрцы і розумы ў агульным вызваленчым імкненні. У часе спектакля «Авечая крыніца» Лопе дэ Вега (1876), дзе маладая Ермолава іграла Лаўрэнсію, якая заклікае сялян да паўстання, — «па ўсёй глядзельнай зале, — як успамінае тагочасны глядач, — пабег электрычны ток, усім перадалося вялікае ўзрушэнне; глядач, які дрыжэў нібы ў ліхарадцы, здаецца, гатовы быў сарвацца з месца і пабегчы за гэтай дзяўчынай-геоаіняй і адпомсціць за надруганую свабоду.

Пасля сканчэння гэтага спектакля моладзь разыходзілася з тэатра, як з рэвалюцыйнага схода. П'еса неадкладна была знята з рэпертуара і знаходзілася пад забаронай доўгія годы.

Гэты вялікі вызваленчы пафас напаўняў «Орлеанскую дзеву», — ролю, у якой Ермолава не ведала суперніц у сусветным тэатры.

«Твоим огнем душа палима — гэтым вершам Пушкіна, любімага паэта Ермолавай, кожны з яе гледачоў мог-бы перадаць тое незабыўнае ўздзейнічанне, якое адчуваў ён ад яе геоаічнага полымя ў «Орлеанскай дзеве», «Зорцы Севільі», «Сафо», «Марыі Сцюарт», «Эгмонце».

У гэтым полымі была вялікая сіла святла і цеплыні, але не было ні шуму, ні трэску, ні непрыемнага паху серы, — нічога з таго, што бывае пры мімалётных феерверках пышнай рыторыкі і напышлівай дэкламацыі, якія выдаюць сябе за трагічны пафас.

Ермолава заўсёды іграла так, як патрабаваў Шылер ад пісьменніка: «Каб словам было цесна, а думцы прасторна». Скрозь «цесната слоў», скрозь здзіўляючую прастату мовы і лаканічнасць ігры Ермолава давала вялікі прастор магутным думкам і бязмежную свабоду пачуццям, захапляючым гледача сваёй праўдай, глыбінёй і харaствам.

Абараняючы мастацтва Шылера ад папрокаў у тым, што яно «прыўзнятае», Ермолава пісала ў адным пісьме: «Так яно прыўзнятае над зямлёй, але не на кадулях, а на крыллях паэзіі».

Гэтыя словы прымянімы да мастацтва самой Ермолавай.

Нішто не было так нянавісна ёй, як усякія «хадулі» у мастацтве: ілжывасць дэкламацыі, фальш траскучых фраз, наігрыш уяўнага пафасу, — і нішто так не было ўласціва ёй, як «крыллі паэзіі». На гэтых магутных крыллях Шэкспіра, Лопе дэ Вега, Гётэ, Шылера ўзнімала вялікая артыстка пачуцці, думку і волю гледача.

Звяртаючыся ў адным з невыданых сваіх пісем да маладых гледачоў, якія былі ўзрушаны створаным ёю вобразам «Орлеанскай дзевы», вызваліцельніцы сваёй радзімы, народнай геоаіні, — Ермолава пісала: «Калі полымя, якое гарыць зараз у вашых маладых душах, загасне зусім, вы загінеце, — памятайце гэта. Вы засушыце сябе, і будзеце няшчаснымі. Няхай ад гэтага полымя застанецца хоць іскарка, але няхай яна гарыць незгасальна да канца вашых дзён».

Гэтае полымя заўсёды было яркім і магутным у творчасці Ермолавай.

У 1920 годзе, у дзень пяцідзесяцігоддзя яе служэння тэатру, Ермолавай была нададзена годнасць народнай артысткі рэспублікі. Яна першая з артыстаў нашай краіны атрымала яе.

Не было сумнення, што вялікая артыстка, чыё мастацтва было — палымнеючы, нямоўчны заклік да свабоды, больш за ўсіх мае на гэта права.

Прымаючы годнасць народнай артысткі, Ермолава проста сказала, што яна сваю душу аддала народу і ўсёй душой належыць народу.

У гэтых простых словах — лепшая ацэнка Ермолавай; яе геоаічнае мастацтва з непараўнальнай сілай і праўдай выказала геоаічны парыў рускага народа да свабоды.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.